БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдачы—XV
№ 264 (4169)
Панядзелак 28 верасьня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫНКА.

байцам, камандзірам і палітработнікам, пасьпяхова скончыўшым манэўры

„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў" (ЦК УсеКП(б.

КАЛГАС „КАМУНАР"

напружанай работай рэалізуе пастанову ЦК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

Да усіх калгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў БССР

Дэтальна абгаварыўшы пастановы ЦК КП(б)Б і бюро Вушацкага райкому КП(б)Б аб чарговых задачах у калгасным будаўніцтве, мы, калгасьнікі калгасу «Камунар», Гарбаніцкага сельсавету, у ліку 170 сем'яў рапартуем раённаму камітэту КП(б)Б, ЦО КП(б)Б «Зьвязьдзе», раённаму выканаўчаму камітэту і раённай газэце «Прымежны калгасьнік» аб сваіх дасягненьнях, якіх мы дабіліся на аснове самага шырокага разгортваньня камуністычных мэтадаў работы — сацспаборніцтва і ўдарництва.

Гэтыя дасягненьні выяўляюцца ў наступным:

Уборка сенажаці з плошчы ў 370 гектараў скончана да 20 жніўня. Да 15-га верасьня скончана ўборка канюшыны другога ўкосу з плошчы ў 20 гэкт.

Лён на плошчы 57 гэкт. выбран, абчосан, замочан і разасланы да 18-га жніўня. Да 10 верасьня ўвесь лён паднят і зьвезен у пуні. Праводзіцца далейшая апрацоўка. 13 верасьня 6 цэнтнераў ільнавалакна здана дзяржаве.

Уборка збожжавых культур яравых пасеваў скончана поўнасьцю да 25 жніўня на плошчы 369 гектараў. 16 верасьня прыступілі да ўборкі бульбы.

Сяўба азімых—жыта і пшаніцы—скончана да 5 верасьня на плошчы 311 гектараў замест плянавых 232. Насеньне жыта ачышчана і пшаніца пратручана на 100 проц.

Да 20 верасьня засіласавана 210 тон кармоў замест 105 тон паводле пляну. Для гэтай мэты скарыстана ўся атава, бульбянік і каляваёрны чарот.

Да 20 жніўня поўнасьцю выканан плян здачы лішкаў сена ў разьмеры 700 пудоў.

Скончана будаўніцтва кузьняў. Адрамантавана хата на 6 сем'яў і склад для збожжа. Падрыхтавана 12 памяшканьняў для сушкі ільну.

У галіне мабілізацыі сродкаў: дагэрмінова ўнесена 130 руб. с.-г. падатку, поўнасьцю ўнесена страхоўка ў суме 700 руб., 500 руб. унесена на машынаабавязацельствы, 400 руб.—на пазыку «Трэці рашаючы», 800 руб.—на акцыі Трактарацэнтру.

Штодзенна выдзеляем на дарожнае будаўніцтва 18 коняй і 36 чалавек.

Да 20 верасьня праведзена зяблева на плошчы 50 гэктараў.

На аснове яшчэ больш шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарництва, на аснове канчаткова ліквідацыі абязьлічкі і кулацкай ураўнялаўкі, на аснове ўкараненьня зьдзельнічыны ва ўсе віды работ абяцаем дабіцца яшчэ больш высокіх посьпехаў і бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Даць поўную нагрузку трох ільнамялкам (трохвальцавым) і выкарыстаць поўнасьцю ручныя ільнамялкі з такім разьлікам, каб да 15 кастрычніка здаць дзяржаве ільнавалакна $^1/_5$ частку, да 1 лістапада $^2/_3$ і да 15 лістапада здачу ільнавалакна закончыць.

Скончыць уборку бульбы на плошчы 53 гэктары да 28 верасьня. Для гэтага вылучыць пастаянныя брыгады з нормай выпрацоўкі на 14 чалавек на 1 гэктар у дзень. Адначасова арганізуем здачу лішкаў бульбы дзяржаве адразу з поля, наладзіўшы добраякасную яе прасушку і перабіраньне.

Да 1 кастрычніка поўнасьцю выканаць плян укамплектаваньня стада птушак да 700 штук (на 20 верасьня налічваецца стада ў 350 штук). Да гэтага-ж тэрміну скончыць будаўніцтва птушніка. Па гадоўлі птушак вылучаем спэцыяльныя брыгады, якія замацоўваем на ўвесь час.

Да 10 кастрычніка скончыць па-за пляном навае будаўніцтва аборы. Для гэтага вылучаем і замацоўваем да канца будаўніцтва пастаянную брыгаду цесьляроў, каменшчыкаў, пільшчыкаў і інш. Адначасова вылучаем брыгады для правядзеньня ацэпленьня памяшканьняў на зімовы час — для кароў, для авечак, сьвіней і птушак. Жывёлу даглядаць у поўнай адпаведнасьці з патрабаваньнямі зоавэтмінімуму.

23 верасьня чырвоным абозам здаць усе лішкі абожжавай прадукцыі (жыта).

Рэгулярна выпускаць і далей насьцен газэты, усім нашымменным і малапісьменным бесьперапынна наведваць ліквпункты і школы малапісьменных.

Усе работы як палявыя, так і па жывёлагадоўлі, будаўніцтве і інш. праводзіць выдзельна з ацэнкай работы ў працадзёх. Брыгады замацоўваць да скончэньня кожнай работы, наладзіўшы ўлік працы як па колькасьці, так і па якасьці.

Выдача натуральных і грашовых аванса ў, а таксама разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю праводзіць выключна па колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка ў адпаведнасьці з пастановай НКЗ і Белкалгасцэнтру.

Ударніцтва і сацспаборніцтва пераўтварыць у штодзенны мэтад калгаснай працы, як вакар бальшавіцкіх тэмпаў, наладзіўшы ўлік выніку яго.

Для прэміяваньня лепшых ударнікаў вылучаем спэцыяльны фонд у разьмеры 250 прададзён.

Вярнуў на сябе гэтыя абавязацельствы, запэўняем раённы камітэт партыі і ўсю КП(б)Б у асобе яе цэнтральнага органу «Зьвязды», што яны будуць на бальшавіцку выкананы. Разам з гэтым выклікаем усе іншыя калгасы Вушачыны і калгасы іншых раёнаў БССР узяць на сябе канкрэтныя абавязацельствы, гыканаць пастановы бальшавіцкай партыі аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Няхай жыве УсеКП(б) і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве пераможная пабудова сацыялізму ў краіне-Савэтаў!

Старшыня калгасу «Камунар»
НАЙДУКОЎ.

АД КАЛГАСЬНІКАЎ: Чывідаеў В., Перванёнак Хв., Шалыга К., Чывідаеў Я., Шалыга Іван, Грыц Хв., Лодзіс В., Сьпірыдзёнак К., Мамяка Ф., Чывідаеў М., Шалыга М., Мамяка К., Корабаў М., Даўгаполаў І., Галімскі Ів., Ермашэнка М., Ермашэнка Ів., Мамяка Я., Шаўчэнка І., Вялюга П., Гедзік Клім, Шалыга Матруна, Галімская М., Шульга Хвядора, Найдунова Н., Шалыга Д., Мамяка Аўдоцьця.

АБ НАВУКОВЫХ КАДРАХ

У «Зьвязьдзе» ад 21 верасьня апублікавана пастанова ЦК КП(б)Б «Аб забесьпячэньні навуковымі кадрамі ВНУ». Гэтая пастанова мае вялікае палітычнае значэньне і адыграе вялізарную ролю ў жыцьці вышэйшай школы і наогул на ідэалёгічным фронце.

Пастанова намячае цэлы рад практычных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх дазволіць, ня гледзячы на надзвычай вялікі недахват навуковых кадраў, забесьпечыць бесьперабойную работу нашых ВНУ і ВТНУ; яна ставіць рад пэўных задач перад камуністамі—навуковымі работнікамі, яно з вычарпальнай выразнасьцю і лёгкасьцю вырашае пытаньне аб адносінах да беспартыйных навуковых работнікаў.

Упершыню ў гэтым годзе было праведзена «ПЛЯНАВАЕ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ, праўда, пакуль што толькі частка навуковых работнікаў (навуковых работнікаў-камуністаў) паміж вышэйшымі навучальнымі установамі. Ня гледзячы на востры недахват навуковых кадраў, (асабліва па грамадазнаўчых дысцыплінах), ня гледзячы на факты супраціўленьня плянаваму разьмеркаваньню, на факты пераманьваньня навуковых работнікаў і г. д., гэта мерапрыемства зусім слабе апраўдана, забясьпечыўшы ў асноўным патрэбы ў нашых ВНУ па грамадзкіх дысцыплінах.

У гэтым-жа годзе было праведзена другое мерапрыемства, якое мае ня менш значэньне, іменна МАБІЛІЗАЦЫЯ ГРУПЫ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ у Віцебск, Гомель, Горкі, Магілеў ДЛЯ ЧАСОВАЙ РАБОТЫ У МЯСЦОВЫХ ВНУ. Гэта мерапрыемства адыграе вялізарную ролю ня толькі ў жыцьці ВНУ ВТНУ, але і ва ўсім культурным жыцьці даных гарадоў.

Цэнтральны Камітэт партыі ў сваёй пастанове поўнасьцю ўхваліў гэтыя мерапрыемствы і пастанавіў пашырыць практыку плянавага разьмеркаваньня на ўсіх навуковых работнікаў, ускладаючы гэту задачу на Наркамасьветы і сэкцыю навуковых работнікаў.

Аднак, адно гэта мерапрыемства, бясспрэчна, ня можа вырашыць праблемы кадраў для нашых ВНУ і ВТНУ. Рашаючае значэньне тут мае ХУТЧЭЙШАЯ ПАДРЫХТОЎКА НОВЫХ ПРАЛЕТАРСКІХ НАВУКОВЫХ КАДРАЎ.

Ужо ў гэтым годзе выкладаньне грамадзкіх дысцыплін у большай частцы ВНУ і ВТНУ знаходзіцца ў руках асьпірантаў. Удзельная вага асьпірантаў у рабоце ВНУ будзе павялічвацца з кожным годам. Доволі сказаць, што створаны нямногім больш паўгода назад ІНСТЫТУТ АСЬПІРАНТУРЫ ПРЫ БАН УЖО ЗАРАЗ НАЛІЧВАЕ КАЛЯ 300 АСЬПІРАНТАЎ І АБСЛУГОЎВАЕ СВАІМІ СІЛІМІ ЎСЕ ВНУ і ВТНУ МЕНСКУ.

Між тым, да гэтага часу справе падрыхтоўкі навуковых кадраў не забясьпечана неабходная ўвага і, галоўнае, КАНКРЭТНАЯ ДАПАМОГА. Цэнтральны Камітэт у сваёй пастанове ўказаў на неабходнасьць прыцягнуць лепшыя навуковыя сілы і ў прыватнасьці навуковых работнікаў-камуністаў для заняткаў з асьпірантамі, у першую чаргу па такіх дысцыплінах, дзе мы ня можам атрымаць кадраў з іншых цэнтраў СССР (гісторыя Беларусі, беларуская літаратура і г. д.).

Разам з тым ЦК абавязаў Менскі гарсавет забясьпечыць асьпірантаў жыльлёвай плошчай (дэ слова сказаць, да гэтага часу інстытут асьпірантуры БАН не атрымаў інтэрнатаў ні на адну асобу). Ажыцьцяўленьне пастановы ЦК павінна забясьпечыць сапраўдную дапамогу з боку ўсёй партыйнай грамадзкасьці, усіх савецкіх і гаспадарчых органаў справе падрыхтоўкі новых пралетарскіх навуковых кадраў.

Вялізарнае прынцыповае значэньне мае рашэньне ЦК аб адносінах да беспартыйных навуковых работнікаў. Тав. СТАЛІН у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў указаў на неабходнасьць «зьмяніць адносіны да інжынэрна-тэхнічных сіл старой школы, праяўляць да іх больш увагі і клопатаў, больш сьмела прыцягваць іх да работы». Гэта адносіцца, зразумела, ня толькі да ІТР, але і да навуковых работнікаў старой школы.

«Напружанае становішчка з навуковымі кадрамі з усёй вострасьцю ставіць пытаньне аб правільным выкарыстаньні старых навуковых спэцыялістаў. Між тым, наглядаюцца асобныя факты недапушчальных адносін да беспартыйных навуковых работнікаў, якія супрэчаць дырэктывам партыі і ўказаньням, даным тав. Сталіным у апошняй прамове. Праводзячы і далей з яшчэ большай рашучасьцю і глыбінёй барацьбу за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію ва ўсіх галінах навукі, ЦК паказвае на неабходнасьць правільных і чулых адносін да ўсіх тых навуковых работнікаў і спэцыялістаў, якія добрасумленна працуюць у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва. Бязьлітасная і рашучая крытыка ўсякіх скажэньняў і адхіленьняў ад марксыцка-ленінскай тэорыі, якая павінна працягвацца і быць узьнята на больш высокі тэарэтычны ўзровень, ні ў якім выпадку не павінна ператварацца ў агульнае шапмаваньне, дробязныя прычэпкі і беспадстаўнае пазбаўленьне магчымасьці далейшай навукова-пэдагагічнай работы і выпраўленьня іх памылак».

ГЭТА РАШЭНЬНЕ ЦК НАКІРАВАНА І СУПРОЦЬ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ, ЯКІЯ ЛІЧАЦЬ МАГЧЫМЫМ АСЛАБІЦЬ ІДЭАЛЁГІЧНУЮ БАРАЦЬБУ, АДМАЎЛЯЮЦЦА АД АКТЫЎНАГА ЎДЗЕЛУ Ў ГЭТАЙ БАРАЦЬБЕ, І СУПРОЦЬ «ЛЕВЫХ» ЗАГІБШЧЫКАЎ, ЯКІЯ НЕ ЗРАЗУМЕЛІ ЛІНІІ ПАРТЫІ У АДНОСІНАХ ДА БЕСПАРТЫЙНЫХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ, ЯКІЯ НЕ ЖАДАЮЦЬ АБО НЯ УМЕЮЦЬ ТАК ВЕСЬЦІ ІДЭАЛЁГІЧНУЮ БАРАЦЬБУ, ТАК ПРАВОДЗІЦЬ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКУЮ КРЫТЫКУ ПАМЫЛАК НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ, КАБ «НЯ ТОЛЬКІ НЕ АДШТУРХОЎВАЦЬ, А ЎСЕ БОЛЬШ ЗАВАЁЎВАЦЬ НА СВОЙ БОК САПРАЎДНЫХ РАБОТНІКАЎ НАВУКІ І ТЭХНІКІ, КАБ ЗАХОЎВАЦЬ ТАВАРЫСКІЯ ФОРМЫ Ў ГЭТАЙ КРЫТЫЦЫ І Ў АДНОСІНАХ ДА ТЫХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ, ЯКІЯ, З ПОСЬПЕХАМ ПРАЦУЮЧЫ Ў ТЭЙ ЦІ ІНШАЙ ГАЛІНЕ, НЕ ПРЫШЛІ ЯШЧЭ ДА ПРАВІЛЬНАГА ЎСЬВЕДАМЛЕНЬНЯ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАГА НАВУКОВАГА МЭТАДУ» (МОЛАТАЎ).

Пастанова ЦК абавязвае, разам з тым, узмацніць работу па марксыцка-ленінскім выхаваньні старых навуковых кадраў, патрабуючы ад камуністаў—навуковых работнікаў больш цікавіцца, а, галоўнае, больш практычна працаваць у такіх арганізацыях, як сэкцыя навуковых работнікаў, ВАРНІТСО, праз якія ў першую чаргу патрэбна праводзіць палітычнае выхаваньне навуковых работнікаў.

ЦК даны дырэктывы, якія абавязваюць Наркамснаб, Белкаапсаюз і адпаведныя гарсаветы прыняць канкрэтныя меры па паляпшэньні матар'яльна-бытавога становішча навуковых работнікаў.

Пастанова ЦК набывае асаблівае значэньне ў сувязі з адказьнейшымі задачамі, якія стаяць зараз перад ВНУ. Пастанова ЦК паставіла перад ВНУ, як важнейшую задачу, «уздым якаснага ўзроўню працы, рашаючае павышэньне аб'ёму ведаў, які дае ВНУ». Гэта задача можа быць вырашана толькі ў тым выпадку, калі мы ліквідуем абязьлічку ў ВНУ, адсутнасьць уліку работы кожнага студэнта, агульны перавод з курсу на курс, калі мы ліквідуем усялякія праяўленьні ўраўнілаўкі, раўненьне на найбольш слабага ў рабоце брыгад і г. д.

Няма сумненьня, што нашыя навуковыя работнікі і камуністы і беспартыйныя з усёй энэргіяй возьмуцца за вырашэньне гэтых задач. Няма сумненьня, што пастанова ЦК выклікае новы ўздым энтузіязму ў масе навуковых работнікаў і яшчэ больш згуртуе іх вакол партыі для барацьбы за пасьпяховае выкананьне адказьнейшай і ганаровай задачы, ускладзенай на ВНУ: «ДАБІЦЦА ТАГО, КАБ У РАБОЧАЙ КЛЯСЫ СССР БЫЛА СВАЯ ЎЛАСНАЯ ВЫТВОРЧА-ТЭХНІЧНАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ» (СТАЛІН).

Аб „дні ўраджаю і калектывізацыі"

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Пастаўленая партыяй задача калектывізаваць да 1-1-1932 г. 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак перавыканана. Па БССР калектывізавана 47 проц. сялянскіх гаспадарак, рад раёнаў перайшоў ужо да суцэльнай калектывізацыі і канчатковай ліквідацыі кулацтва, як класы.

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» будзе праходзіць ва ўмовах далейшага разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, завяршэньня на аснове пасьпяховага выкананьня плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі фундаманту сацыялізму. Асноўнай задачай «Дня калектывізацыі» павінна быць далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне існуючых калгасаў, правядзеньне масавай растлумачальнай работы за завяршэньне суцэльнай калектывізацыі БССР ў 1932 годзе і выкананьне ўсіх бягучых гаспадарча-палітычных задач (загатоўкі, асьпляня сяўба і г. д.) шырокае растлумачэньне сярод калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў пастановы ЦК КП(б)Б «Аб чарговых задачах у калгасным будаўніцтве».

Выходзячы з гэтага, Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. «Дзень ураджаю і калектывізацыі» правесьці з 14-га па 25-га кастрычніка і ператварыць гэту кампанію ў масавую мабілізацыю рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне калгасаў, на ліквідацыю прарываў па ўборцы і асабліва арганізацыі пераапрацоўкі тэхкультур і здачы бульбы, поўнае скончэньне асеньняй сяўбы і ворыва пад зяб, правядзеньне аграмінімуму, поўнае выкананьне плянаў загатовак збожжа і бульбы, поўнае скончэньне будаўніцтва ў саўгасах і калгасах і выкананьне плянаў па мабілізацыі сродкаў.

2. Разгарнуць работу на аснове шырокай папулярызацыі гаспадарчых дасягненьняў калгасаў па далейшай калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак, рашуча пакончыць з самацёкам у гэтай оправе, ажыцьціць работу вярбовачных камісій у калгасах і ініцыятыўных груп у вёсках.

3. Партарганізацыям зьвярнуць галоўную ўвагу на практычныя мерапрыемствы па арганізацыйным і гаспадарчым замацаваньні калгасаў, канчатковым перафводзе ўсіх калгасаў на зьдзельнічыну і дасканалы ўлік працы ў іх, зьнішчэньні бестаспадарчасьці ў калгасах і саўгасах, далейшай спэцыялізацыі калгасаў, поўнай ачысьцы калгасаў ад кулацкіх і інш. шкодніцкіх элементаў, лічачы гэта, як асноўную практычную задачу ў справе далейшага ўзмацненьня калгаснага будаўніцтва.

4. Калгасам, арганізаваць ва ўсіх раёнах работу на шырокай спрэасфарчасьці пашырэньні шырокімі масамі аб вынніках гадавой працы, падрыхтаваўшы ва ўсіх калгасах пляны разьмеркаваньня ўраджаю і прыбытку, і прыстасаваўшы выдачу першай паловы даходу.

5. Даручыць фракцыі ЦСПСБ правесьці масавую работу па прадпрыемствах вакол правядзеньня «Дня ўраджаю і калектывізацыі», сканцэнтраваўшы ўвагу рабочых на посьпехах сацбудаўніцтва ў справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і на задачах, якія стаяць перад рабочымі на далейшай калектывізацыі вёскі, практыкуючы выезды шэфскіх арганізацый у калгасы, вёскі для правядзеньня кампаніі «Дня ўраджаю і калектывізацыі», а таксама падвышаючы ўдзел у правядзеньні кампаніі з боку вясковых прафарганізацый.

6. На аснове адозвы ЦК і Саўнаркому аб жывёлагадоўлі шляхам арганізацыі сустрэчных плянаў, арганізаваць шырокую работу на камплектаваньні калгасных таварных фэрм і саўгасаў.

7. ЦК КП(б)Б зьвяртае ўвагу партарганізацый МТС і саўгасаў на іх перадавую арганізуючую ролю ў правядзеньні «Дня ўраджаю і калектывізацыі», што патрабуе разгортваньня шырокай работы і ініцыятывы па арганізацыі калгасных мас і аднаасобнікаў вакол выкананьня задач «Дня ўраджаю і калектывізацыі».

8. У часе правядзеньня «Дня ўраджаю і калектывізацыі» шырока разгарнуць сацспаборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі і вёскамі на поўную рэалізацыю ўсіх мерапрыемстваў, асабліва па ўборцы бульбы і апрацоўцы тэхкультур, скончэньні сяўбы і ворыва, поўным выкананьні загатовак збожжа і бульбы і максымальнай мабілізацыі сродкаў.

9. Абавязаць ЦК ЛКСМБ зараз-жа выпрацаваць мерапрыемствы па нагадоўным удзеле ўсіх камсамольцаў у правядзеньні «Дня ўраджаю і калектывізацыі», ускласьці на камсамольскія арганізацыі задачу ператварэньня «Дня ўраджаю і калектывізацыі» ў масавае сьвята працоўнага сялянства за новую калгасную вёску, за новы сацыялістычны быт.

10. Арганізаваць у часе правядзеньня «Дня ўраджаю і калектывізацыі» ва ўсіх раёнах с.-г. выстаўкі па паказе дасягненьняў калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, надаўшы ім спэцыялізаваны характар па раёнах.

11. Абавязаць цэнтральны і раённы друк і радыё шырока асьвятляць ход работы па падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі «Дня ўраджаю і калектывізацыі» на сваіх старонках, арганізуючы пераклічкі мясцовых арганізацый па пытаньнях зьвязаных з гэтай кампаніяй.

12. Даручыць Белдзяржвыдавецтву своячасова выпусьціць папулярную літаратуру да «Дня ўраджаю і калектывізацыі».

13. Для кіраўніцтва ўсёй работай па правядзеньні кампаніі стварыць цэнтральную камісію ў складзе т.т. Рачыцкага, Міцькова, Гуткіна, Плешакова і Каршакевіча.

Прапанаваць РК КП(б)Б складзі камісіі ў раёнах.

Практыку перадавых — адстаючым

Апошняя дэкада дала вельмі пязначны зрух у выкананьні пляну сіласаваньня па БССР. Калі на 10 верасьня плян быў выканан па 12,4 проц., дык на 20 верасьня мы маем 20,6 проц. За 10 дзён выканана 8,2 проц. агульнага пляну. Індывідуальны сэктар за 10 дзён выканаў толькі 2,3 проц. Рад раёнаў, як **Веткаўскі, Нараўлянскі, Рэчыцкі, Чырвона-Слободзкі, Уваравіцкі, Чавускі, Чэрвеньскі, Расонскі** нават ня выканалі і 10 проц. пляну.

Рад перадавых раёнаў мабілізавалі ўвагу калгасных мас і аднаасобнікаў, і значна пасунуліся ўперад у галіне сіласаваньня. Так, Лёзьнянскі раён за 10 дзён выканаў 19,8 проц. пляну, **Талачынскі** — 40,5 проц. і **Чашніцкі** — 43,9 проц.

Асабліва ўзорны прыклад работы паказвае **Чачэрскі раён, які ўжо засіласаваў 1.601 тону — 58 проц. заданьня, Талачынскі раён — які засіласаваў 12.805 тон — 57,6 проц. пляну і Чашніцкі раён, які засіласаваў 9.701 тону—49,7 проц.**

Гэтыя лічбы паказваюць, што пляны сіласаваньня ня ўсюды рэальныя і пры мабілізацыі вакол гэтага пытаньня вясковай грамадзкасьці, шырокіх мас калгаснікаў і аднаасобнікаў, ня ўсюды магчымы для выкананьня.

Практыку перадавых раёнаў трэба распаўсюдзіць на ўсе адстаючыя раёны БССР.

Раёны БССР павінны ўзяць прыклад з Слуцкага раёну, дзе ўвесь партыйны, камсамольскі і прафсаюзны актыў зараз кінуты на сіласны фронт.

1-га кастрычніка — апошні тэрмін сіласаваньня. Трэба неадкладна ліквідаваць разрыў паміж выкананьнем пляну сіласнага будаўніцтва і самім сіласаваньнем. У радзе раёнаў сіласныя ямы ўсё яшчэ пустуюць. Бульбянік і атава ўжо даўно пасьпелі і пачынаюць псавацца. Неадкладна запоўніць усе пабудаваныя сіласныя ямы — першачарговая задача жывёлагадоўчых гаспадарак, саўгасаў і калгасных таварных фэрм. Увесь другі ўкос павінен быць скошаны на сілас.

Ні аднаго гэктару бульбяніка і атавы другога ўкосу не пакінуць на полі — усё закласьці ў сіласныя ямы.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

„Калгаснае збожжа нікуды ня дзенецца"

—ТАК РАЗВАЖАЮЦЬ ТАЛАЧЫНСКІЯ АПАРТУНІСТЫ

ЯНЫ ЗАБЫЛІ АБ СЛОВАХ тав. СТАЛІНА, ШТО „ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ"

„Няма чаго сьпяшацца

ТАЛАЧЫН. (Брыгада «Зьвязды»).

Верасень мае вялікае значэньне ў выкананьні пляну збожжазагатовак. Між тым, у ТАЛОЧЫНСКІМ раёне тэмпы збожжазагатовак увесь час знаходзяцца на нізкім узроўні. Гедавы плян па раёне на 20-га верасьня выканан толькі на 21,3 проц. Калгасы выканалі ўсяго на 13,2 проц. свайго пляну.

Значная частка парт'ячэек і сельсаветаў не вядзе барацьбы з кулацкім сабатажам збожжазагатовак. У адносінах да кулакоў — злосных нездатчыкаў ня прымаецца рашучых мер. Ёсьць выпадкі, калі судовыя справы, узьнятыя супроць кулакоў, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, па цэлых дэкадах марынуюцца ў нарсудзе.

Райкалгасаюз ў збожжазагатоўчай кампаніі ня прымае амаль ніякага ўдзелу. Паасобныя работнікі калгасаюзу лічаць, што, «КАЛГАСНАЕ ЗБОЖЖА ЎСЁ РОЎНА НІКУДЫ НЯ ДЗЕНЕЦЦА, І ТАМУ НЯМА ЧАГО СЬПЯШАЦЦА». Гэтыя шкодныя настрої не сустракаюць належнага адпору з боку кіруючых раённых арганізацый.

РОЖАНЕЦ, ЧАПЛІНСКІ.

Дагэтуль нямазруху

БРАГІН. (Брыгада «Зьвязды»).

Заданьне на збожжазагатоўках у раён паступіла своячасова. Але раённыя загатоўчыя арганізацыі не сьпяшаліся. Сьпісы кантрактантаў увесь час марыналіся ў райкаапсаюзе і толькі гэтымі днямі райкаапсаюз накіраваў іх у сельсаветы.

Як вынік атрымалася тое, што раён за жнівень гадавы плян збожжазагатовак выканаў толькі... на 1 проц. Калгасы, якія павінны былі паказаць прыклад у загатоўках, выканалі плян на 2,5 проц 15 дзён верасьня не далі патрэбнага зруху. На 15 верасьня калгасы выканалі толькі 10,9 проц. заданьня.

Некаторыя калгасы спасылаюцца на «аб'ектыўныя прычыны», (недахват малатарань і інш.). У той-жа час ёсьць рад фактаў, калі малатарні стаяць цэлымі днямі бяз руху. Напрыклад, у Дубліна трактары і малатарні стаяць з-за недахвату гаручага і розных дробных дэталяй.

Яшчэ горш праходзяць збожжазагатоўкі ў аднаасобным сэктары. На 15-га верасьня аднаасобным сэктарам плян выканан на 6,5 проц. Кулацка-заможныя элементы ня выконваюць цьвёрдых заданьняў па збожжазагатоўках. У Глухавіцкім сельсавеце цьвёрдыя заданьні даны 51 кулацка-заможнай гаспадарцы, а здалі збожжа толькі 2 гаспадаркі. У Лубяніцкім сельсавеце кулацка-заможныя гаспадаркі да гэтуль яшчэ не здалі ні аднаго кілёграму збожжа. Сельсаветы ня ўжываюць ніякіх мер да спагнаньня цьвёрдых заданьняў. Гэтым карыстаюцца кулакі і сплаўляюць збожжа прыватніку.

Ц. Гіподзі, Півуноў.

НЯ ВЕДАЮЦЬ НАВАТ ПЛЯНУ

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

Загатоўкі гародніны і садавіны на Вушацкім раёне не разгорнуты належнымі тэмпамі. Райспажыўсаюз павінен загатовіць і адгрузіць пралетарскім цэнтрам 10 тон гуркоў, загатоўлена-ж на 15 верасьня толькі... 62 цнт., з якіх адгружана 49 цнт.; яблык трэба загатовіць 60 тон, а загатоўлена 70 цтн., з якіх адгружана 41 цтн.; капусты замест 25 тон загатоўлена 9 цтн. і ніводнага цэнтнэра не адгружана.

Яшчэ горш стаіць справа на сыстэме райкаапсаюзу. Тут ня толькі ня выконваюцца пляны, але нават няма ніякіх вестак аб ходзе кампаніі. Кіруючыя работнікі райкаапсаюзу спадзяюцца выключна на самацёк. **«Калгасы самі адвозяць гародніну на станцыі, мы ніякіх вестак ня маем»,** — заяўляюць яны. Характэрна, што ў райкаапсаюзе ня ведаюць нават пляну загатовак гародніны і садавіны. Адны работнікі кажуць, што трэба загатовіць 400 тон яблык, а другія — 95 тон.

Працоўная грамадзкасьць раёну не мабілізавана на правядзеньне загатовак садавіны і гародніны і адгрузкі іх пралетарскім цэнтрам.

Ян Ліпаўка.

„Пасьпеем яшчэ выкапаць бульбу"

СЛУЦАК.

На 25 верасьня масавая ўборка бульбы па раёне ня была яшчэ разгорнута. Райза і райкалгасаюз нічога не зрабілі для арганізацыі ўборкі. Калгасы, а таксама і раённыя арганізацыі ня маюць каляндарных пляноў уборкі.

Толькі калгас «СЕРП і МОЛАТ» склаў плян уборкі, абгаварыў нормы выпрацоўкі, арганізаваў брыгады і прыступіў да масавай уборкі бульбы. Рэшта-ж калгасаў адкладваюць уборку з дня на дзень.

Л. В. ЯРГОЛІН.

Перадавікі збожжазагатовак

Аболіцкі сельсавет перавыканаў гадавы плян

ТАЛАЧЫН, 25.

АБОЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ ДАВІЎСЯ ВЯЛІКІХ ПОСЬПЕХАЎ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, **НА 25-ГА ВЕРАСЬНЯ СЕЛЬСАВЕТ ВЫКАНАЎ 101 ПРОЦ. ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ.** ГЭТЫ ПОСЬПЕХ ДАСЯГНУТЫ З ВЫНІКУ ШЫРОКА РАЗГОРНУТАЙ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ І ДОБРА АРГАНІЗАВАНАЙ ПРАЦЫ ЗАГАТОЎЧЫХ ОРГАНАЎ.

НАБЛІЖАЮЦЦА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ГАДАВЫХ ЗАДАНЬНЯЎ: **САКОЛІНСКІ** СЕЛЬСАВЕТ, ЯКІ НА 25-ГА ВЕРАСЬНЯ ЗАГАТОВІЎ 86,5 ПРОЦ. ПЛЯНУ І **ДРУЦКІ** — 72,6 ПРОЦ.

БРЫГАДЗІР «ЗЬВЯЗДЫ» РОЖАНЕЦ.

СМАЛЯВІЧЫ.

КАЛГАС **«ЧЫРВОНЫ ПУЦІЛАВЕЦ»** ПЕРАВЫКАНАЎ СВАЁ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ. ЗАМЕСТ 40 ЦЭНТН. ЖЫТА, ВЫЗНАЧАНЫХ ЗАДАНЬНЕМ, КАЛГАС ЗДАЎ 50 ЦЭНТНЭРАЎ, ПШАНІЦЫ ЗДАНА 10 ЦЭНТНЭРАЎ ЗАМЕСТ 8.

ЗЕРБІН.

Супакоіліся на жнівеньскіх посьпехах

СЛУЦАК.

У жніўні Слуцкі раён выканаў месячны плян збожжазагатовак на 142 проц. Раённыя арганізацыі, задаволеныя гэтым посьпехам—у верасьні супакоіліся і паспадзяваліся на самацёк. У выніку за 15 дзён плян выканан толькі на 20,9 проц., а гадавы—на 12,3 проц. Асабліва адстаюць калгасы, якія выканалі месячнае заданьне толькі на 4 проц.

Па цьвёрдых заданьнях ад кулацка-заможных гаспадарак за тры пяцідзёнкі верасьня паступіла 158,4 тоны. Колькі-ж у сапраўднасьці павінна было паступіць—ніхто ня ведае, бо пляну няма.

РВК ня ведае як ідуць загатоўкі па паасобных сельсаветах. Камісіі садзейнасьці ў большасьці сельсаветаў нічога ня робяць.

Апарат слуцкага аддзяленьня Саюзхлеба абвясьціў сябе ўдарным, аднак ня выконвае сваіх абавязацельстваў. Здатчыкам збожжа прыходзіцца па некалькі раз хадзіць за грашыма.

Раённая газэта «Ленінскі шлях» не мабілізавала рабськораў на барацьбу за хлеб. Сярод іх не праводзіцца ніякай работы. Патрэбны рашучыя меры для ўзмацненьня збожжазагатовак.

Брыгадзір «Зьвязды» П. Н.

САЎГАСЫ ЗАЦЯГВАЮЦЬ СЯЎБУ АЗІМЫХ

Не тармазіць перакідку 80 проц. трактараў і 30 проц. конскай цягавай сілы на зяблева

Зводка

аб ходзе асеньняй сяўбы і зяблева па Саўгастрэстах і іншых саўгасных сыстэмах па становішчы на 20-IX

НАЗВА САЎГАСНЫХ СЫСТЭМ	Засеяна азімымі ў проц. да пляну.	У тым ліку			Узьнята зяблева ў проц. да пляну.
		Жыта ў процантах	Пшаніца ў проц.	Азім. віка ў проц.	
Белсельтрэст	88,3	92,7	83,2	18,6	9,8
Белкантора «Сьвіноваду»	55,3	57,0	19,5	—	4,2
Насентрэст	69,4	70,5	64,0	61,9	4,6

АДБОИ ДАН МАНЭУРЫ ЧАСЬЦЕЙ РСЧА СКОНЧЫЛІСЯ

Манэўры паказалі вялікую адданасьць байцоў генэральнай лініі партыі, вялізарныя посьпехі ў тактычна-баявой вывучцы войск



Галоўная вуліца Менску ў часе трывогі.

Узоры дысцыплінаванасьці і адданасьці рабоце

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (Спэцкор Белта). Чырвонаармеец тав. СІРАБАБА (№-скі кавалерыйскі полк) атрымаў загад даставіць данясеньне камандаванью палка. Па дарозе трэба было праехаць праз мост. Пад'ехаўшы да яго, тав. Сірабаба ўважыў, што мост заняты «праціўнікам». На вачох «праціўніка» тав. Сірабаба, узяўшы данясеньне ў рот, каб ніводзін яго на выпадак затрыманьня не кінуўся плысьці на кані і пераехаўшы праз рэчку. Данясеньне было даставлена без затрыманьняў.

***

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (Спэцкор Белта). Курсант школы №-скага палка тав. КАЛПАК павінен быў даставіць важны і тэрміновае данясеньне. Мост на дарозе быў заняты «праціўнікамі». Ня ўгадаўшы думаючы, тав. Калпак узяў два коні і на іх перабраўся праз раку. Адначасова даставленае данясеньне дамагло пасьпяховаму ходу «бою».

***

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (Спэцкор Белта). Разьдзел сувязі №-скага палка спыніўся на начлег у вёсцы П. Чырвонаармейцу-ўдарніку тав. ЛЯЎЧУКУ было даручана прывесьці прадукты з суседняй вёскі, дзе знаходзіўся абоз. Уночы па дарозе з абозу павозка загрузла ў балоце. Тав. Ляўчук вярхом на кані, узяўшы цяжкі мяшок з прадуктамі на сьпіну, даставіў іх у разьдзел своячасова, паказаўшы высокую дысцыплінаванасьць і клопаты аб таварышах.

***

Трэці разьдзел 4-ай роты №-скага стралковага палка атрымаў загад зрабіць супрацьтанкавую загарадку. Байцы разгарнулі паміж сабой сацпаборніцтва. Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, заданьне было выканана раней тэрміну. Таксама тэрмінова былі выкананы заданьні па іншых работах.

Камандзір разьдзелу тав. Андрэеў асабістым прыкладам дабіўся таго, што разьдзел стаў адным з лепшых у палку.

Героі--ўдарнікі палёў манэўраў

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (БЕЛТА). АДЗНАЧЕНЬНЕМ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ-ГЕРОЯЎ МАНЭЎРАНЫХ ПАЛЕЎ.

КАМАНДА КАБЭЛЬНАЙ РОТЫ ПЕРАТРЫМАЛА ЗАДАНЬНЕ ПРАВЕСЬЦІ ЛІНІЮ СУВЯЗІ ПАМІЖ СТАЦЫЯЙ І ШТАБАМ КОРПУСУ. ТРЭБА БЫЛО ПРАВЕСЬЦІ ЛІНІЮ НА ПРАЦЯГУ 28 КІЛЯМЭТРАЎ. ПРАЦА АДБЫВАЛАСЯ ПЕРАЧУ ПАД ВЕСЬПЕРАПЫННЫМ ПРАДЗЬЛЕНЫМ ДАЖДЖОМ. ПА ДАРОЗЕ ПРАВОДЗІЛАСЯ ВЫЦЯГВАЦЬ ФУРГОНКІ, ЯКІЯ ЗАГРУЗАЛІ Ў ВАЛОЦЕ, ВЫТЯГВАЦЬ ІХ НА САБЕ. ЯН ГЛЕДЗЯЎ НА ЦЯЖКАСЬЦІ, ЗАДАНЬНЕ БЫЛО ВЫКАНАНА ДАСКАНАЛА Ў ТЭРМІН, БЕЗ АДЗІНАГА ЗАХВОРВАНЬНЯ. ЗА ЎЗОРНУЮ РАБОТУ ЎСЯМУ СКЛАДУ РОТЫ АБВЕШЧАНА ПАДЗЯКА.

ВАЕНКОМ РОТЫ ЗЕЛЕНАЎ НЕАДСТУПНА ЗНАХОДЗІЦЬСЯ З БАЙЦАМІ І НЕПАСРЭДНА КІРАВАЎ РАБОТАЙ. ЗА РАШУЧАСЬЦЬ, АДВАГУ І ІНІЦЫЯТЫВУ ЯМУ АБВЕШЧАНА ПАДЗЯКА І ЎЗЬНЯТА ХАДАЙНІЦТВА АБ УЗНАГАРОДЗЕ.

КАМАНДЗІРЫ РОТ КАЗЛОЎ, ГРЫШЫН, КОРБУТ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ СВАІМ УМЕНЬНЕМ АСАБІСТЫМ ПРЫКЛАДАМ ВЫХОЎВАЦЬ БАЙЦОЎ І ЎЗЬНІМАЦЬ БАЯВУЮ ПАДРЫХТОЎКУ І ДЫСЦЫПЛІНУ.

ВЫКОНВАЮЧЫ АПЭРАЦЫЙНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА РАЗЬВЕДЦЫ Ў ДАЖДЖЛІВУЮ НОЧ, ЭКІПАЖЫ АВІЯЭСКАДРЫЛІЙ І ЭСКАДРЫЛІЙ «УЛЬТЫМАТУМ» ДАЛІ КАШТОЎНЫЯ ДАНЫЯ АБ «ПРАЦІЎНІКУ». ЗА ДОБРАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯЎ ЭКІПАЖ ЭСКАДРЫЛІЙ: Т. Т. ІВАНОЎ, МАРКЕВІЧ, ЦІХАНАЎ, МАЦЬВЕЕЎ, УСОЎСКІ І ЧУВАЕЎ АТРЫМАЛІ ПАДЗЯКУ. АБВЕШЧАНА ПАДЗЯКА ЛЁТНІКУ ДЗЯНІСЕНКА І ЛЁТНАБУ НАВАЕВУ. ЗА ЎДАРНУЮ РАБОТУ Ў ПАЛЯВЫХ УМОВАХ АБВЕШЧАНА ПАДЗЯКА БРЫГАДЗЕ ТЭХСКЛАДУ Т. Т. ЯКУНЕНКА, СТАМБУРГУ І ЗОРЫЧУ.

Час манэўраў на заводзе імя Варашылава Першая дапамога.

Танкі--у „баі“

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 26. (Спэцкор Белта). 25-га верасьня адбываліся манэўры «баі». Яны асабліва цікавы тым, што паказалі на справе ўзаемадзеяньнасьць паміж пяхотай і танкавымі часьцямі. Чырвонаармейцы з вялікім імпэтам прымалі ўдзел у баёх. Танкавыя часьці паказалі ўзор сумеснай бая і работы з пяхотай. Работа танкаў характарызавала вялікую магутнасьць новых механізаваных часьцей. Танкі, разам з пяхотай атакавалі і ўзялі ў полон бронецягнік.

Два новых ільназаводы

ПОЛАЦАК. (Наш. кар.). Белільнаканапазводсаюз прапанаваў полацкаму райсавету выступіць да пабудовы яшчэ двух ільназаводаў. На кожны новы завод будзе дана нагрузка па апрацоўцы ўраджаю ільну з 1.000 гектараў.

Зараз выбрана месца для пабудовы гэтых заводаў у пунктах Гараны і Сухі Лог. Гэтымі ільназаводамі будуць абхопны ільнаводныя гаспадаркі Бельскага, Дрывіцкага, Сястронскага, Баярскага, Ясаўскага, Сосьніцкага, Шацілаўскага, Ваўлянскага, Даменікоўскага, Вэрхаўскага і Сапоніцкага сельсаветаў.

Заводы будуць пушчаны ў эксплёатацыю ў будучым годзе.

А. Ш.

Рашаючыя „баі“

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 26. (Спэцкор Белта) Усю мінулую ноч часьці чырвоных вялі разьведку пярэдняга краю абароначай паласы «праціўніка». Ня ведзячы на гэта, «сінім» удалося нязрыменна адарвацца галоўнымі сіламі ад чырвоных і своячасова арганізаваць абарону на другім загадзя падрыхтаваным, рубяжы.

Калі намеры «праціўніка» былі выкрыты, чырвоныя хутка пасунуліся наперад, але былі спатканы жорсткім зьнішчальным агнём часьцей «сініх».

Неаднаразовыя атакі асобных часьцей чырвоных засталіся без вынікаў, і «праціўніку» ўдалося ўтрымаць пазыцыі амаль на ўсім вучастку.

Бесьперапынныя дзеяньні войск на працягу некалькіх сутак за ўмовах дрэннага надвор'я не зламалі волі байцоў і камандзіраў да максымальнага ўдасканаленьня тактычна-спраўковай падрыхтоўкі, да аўладаньня тэхнікай на манэўраных баёх, яшчэ больш загартавалі байцоў, якія паказалі вялікую вытрымаласьць і палітычную сьвядомасьць. На манэўраных палёх куецца валявы камандзір. Гэта пацьвярджаюць рад фактаў умелага ініцыятыўнага дзеяньня і геройскіх паводзін байцоў і камандзіраў.

Камандзір разьдзелу 2-ой роты №-скага палка т. Мядзьведзеў, знаходзячыся ў разьведцы, быў акружаны двума разьдзеламі «сініх». Тав. Мядзьведзеў вырваўся з «абнімкаў праціўніка» і, карыстаючыся цемрай ночы, нязрыменна папоўз да рэкі, пераплыў яе і дастаўў камандзіру карту з нанесенай на ёй схэмай знаходжаньня часьцей «праціўніка».

Камандзір 2-га батальёну №-скага палка, праводзячы ноччу пошукі «праціўніка» і ня выкрыўшы яго на [illegible] вучастку, праводзіў пошукі [illegible] пары, пакуль не знайшоў «праціўніка» і завязаў з ім «бой». У выніку была выкрыта групоўка «сініх» і выяўлен пярэдні край абароны.

Камроты №-скага палка Булгакоў і палітрук Хазан паказалі ўзоры ўдарнай работы. Рота дзейнічала ў галоўнай заставе, перамогшы некалькі перашкод, яна фарсавала раку, выйшла ў тыл «сініх», адрэзаўшы батальён і два эскадроны.

5-ы эскадрон №-ската кавалерыйскага палка абышоў з правага фляну чырвоных, захапіў у палон сапёрную роту, сапёрны батальён, кулямётную роту і батарэю, вывеўшы гэтыя часьці са строю на дзьве гадзіны. Работа эскадрону прызнана адменнай. Камандзіру і палітруку абвешчана падзяка. Асабліва вызначыліся камандзір разьдзелу Трушынсні і камандзіры аддзяленьняў Якаўлоў і Андрэйчыкаў.

Раніцой часьці чырвоных пры падтрыманьні 2-х дывізыёнаў артылерыі і танкавай часьці атакавалі вышыні «сініх».

«Праціўнік» аказаў упартае супраціўленьне, але, уступаючы перавазе жывой сілы і тахнікі чырвоных, пачаў адступаць.

26-га верасьня павінны адбыцца рашаючыя баі.

У часе манэўраў СПА на абутковай фабрыцы (Менск).

Супраціўленьне „сініх“ зломлена

РАЁН МАНЭЎРАЎ, (Белта). У 8 гадзін раніцы 26-га верасьня пачуўся ўзмоцнены артылерыйскі агонь, пасьля чаго чырвоныя перайшлі ў наступленьне.

Пасьля ўпартага «бою» ў 14 гадзін 30 хвілін часьці чырвоных, пусьціўшы танкі і інш. тэхнічныя сродкі барацьбы, зламалі супраціўленьне «сініх» і аўладалі другім рубяжом узмоцненай паласы. Шмат дапамагла своячасова наладжаная штурмавая авіяцыя, якая атакавала «праціўніка».

Пасьля гэтага быў дан адбой. Манэўры скончыліся.

Трэці этап манэўраў адзначыўся новым узьдымам баявога энтузіязму байцоў і начальніцкага складу. Манэўры яшчэ раз пацьвердзілі самаахвярную адданасьць байцоў партыі і рабочай клясе.

Поўнае падтрыманьне чырвонаармейцамі генэральнай лініі партыі знайшло сваё праяўленьне ва ўступленьні ў партыю і камсамол 1.500 чал., у калгасы— 1.400 чал., ва ўзорным выкананьні баявых задач.

Апошні этап, як і папярэднія, выявіўся праверкай баявых якасьцяй камандзіра, яго ўменьня змагацца і кіраваць у складаных умовах сучаснага бою.

МАКЕЕЎСКІЯ ЗАВОДЫ. На здымку — домна № 4 і сілавая станцыя.

Савецкае будаўніцтва

АГЛЯД РАБОТЫ САВЕТАЎ— праверка іх перабудовы, адпаведна задачам трэцяга рашаючага

Пастаноўка масавай работы гарадзкіх і сельскіх саветаў далёка не адпавядае запатрабаваньням сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва. Работа саветаў перабудоўваецца вельмі марудна, большасьць іх яшчэ не выстарчальна пераключылася на новыя формы работы, якія-б забясьпечылі кіруючую ролю саветаў у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, сацыяльную калектывізацыю, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгас[illegible] і г. д. Сэкцыі большасьці саветаў [illegible]юць вельмі слаба і бясплянава, [illegible]ота дэпутацкіх груп не разгорнута.

У Лепелі прышлося распусьціць за бязьдзейнасьць сэкцыі РСІ і камунальнай гаспадаркі гарсавету.

На рэчыцкіх прадпрыемствах ёсьць прарывы ў выкананьні прамфінпляну, не разгорнута сацспаборніцтва. Гарсавет стаіць у баку ад барацьбы за прамфінплян, ня ўжывае рашучых мер для ліквідацыі прарываў.

Вельмі слаба працуюць дэпутацкія групы. У Барысаве—адным з буйнейшых прамысловых цэнтраў—групы існуюць толькі на трох прадпрыемствах. Яны замкнуліся ў сабе, складаюцца выключна з членаў і кандыдатаў гарсавету, ня ўцягваюць актыву і рабочых-ударнікаў.

Ёсьць вельмі станоўчыя прыклады работы груп. На магілеўскай шоўкавай фабрыцы імя Валадарскага дэпутацкай групай ахоплена большасьць ударнікаў. Група ўпарта змагаецца за выкананьне прамфінпляну. Прамфінплян па фабрыцы за другі квартал выкапан на 103 проц.

Дэпутацкая група менскай абутковай фабрыкі абсьледавала становішча падшэфнага саўгасу, прымацавала да яго сваіх членаў для работы, прыняла рад канкрэтных мер па паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, энергічна змагалася за выкананьне прамфінпляну. Дэпутаты наладзілі збор рацыяналізатарскіх прапаноў па цэхах. Вопыт работы гэтых дзьвёх груп даказвае ўсю мэтазгоднасьць існаваньня дэпутацкіх груп на прадпрыемствах; яго трэба пашырыць і на іншыя заводы і фабрыкі.

Сэкцыям трэба надаць больш самастоя[illegible]асьці, апэрацыйнасьці. Неабходна арганізаваць дэпутацкія групы на ўсіх прадпрыемствах, ажывіць іх работу. На фабрыках і заводах павінны быць арганізаваны пасты гарсавету для абмену вопытам, сувязі з масамі выбаршчыкаў, уліку работы дэпутатаў і інфармацыі. Для работы з дэпутацкімі групамі трэба арганізаваць кадр па-за штатных інструктароў.

Неабходна наладзіць дакладны ўлік работы кожнага дэпутата. Апошнім павінны быць выданы спэцыяльныя кніжкі, у якіх адзначаецца праробленая дэпутатамі работа.

Неабходна дабіцца таго, каб дэпутацкая група на прадпрыемстве стаяла ў авангардзе барацьбы за прамфінплян, за паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых і г. д.

20 кастрычніка пачынаецца справаздачная кампанія саветаў

З 10 кастрычніка па БССР пачынае праводзіцца агляд работы гарадзкіх і сельскіх саветаў. Агляд мае мэтай праверыць выкананьне саветамі палітычна-гаспадарчых кампаній, ажыцьцяўленьне наказу выбаршчыкаў, разгарнуць масавую работу саветаў.

У перыяд паміж 20-м кастрычнікам і 10 лістапада будзе праведзена справаздачная кампанія саветаў, за выключэньнем Менскага і Віцебскага гарсаветаў, якія ўжо зрабілі справаздачы перад выбаршчыкамі. Перад пачаткам справаздачнай кампаніі павінны быць складзены брыгады з рабочых і калгасьнікаў, якія праверяць выкананьне наказаў выбаршчыкаў і зробяць дакклады на справаздачных сходах. На сходах будуць заслуханы справаздачныя даклады дэпутатаў саветаў аб праробленай імі працы. Справаздачы павінны выявіць, ці справіліся дэпутаты з задачамі і абавязкамі, якія на іх усклядзены.

Справаздачная кампанія павінна дапамагчы ажыўленьню масавай работы саветаў, ліквідаваць прарывы ва ўсіх галінах гаспадарча-культурнага будаўніцтва, узмацніць сувязь саветаў з масамі выбаршчыкаў, яшчэ больш узняць ролю саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі.

„Кастрычнік“ і „Камунарка“ не вылучаюць сацнамесьнікаў

(Гутарка з старшынёй МенгарКК-РСІ тав. Кенігам)

— Пасьля нарады сацнавесьнікаў, якая была склікана гарКК-РСІ і гарпрафсаветам 12 верасьня, вызначыўся некаторы зрух у шэфскай рабоце. Многія сацнамесьнікі ўстанавілі жывую непасрэдную сувязь з гарКК, сыгналізуюць аб перашкодах у сваёй рабоце, на якія гарКК неадкладна рэагуе.

Весткі, якія мы атрымліваем, сьведчаць аб тым, што бюракратычныя, фармальныя адносіны да сацнамесьнікаў з боку падшэфных устаноў яшчэ ня ліквідаваны.

У дзяржбанку, над якім шэфствуе завод «Бальшавік», сацнамесьнікаў адразу садзяць за папкі з цыркулярамі і «працуйце», бяз усякага тлумачэньня і дапамогі.

Калі сацнамесьнікі хэмфармзаводу прыходзяць у падшэфную ўстанову— ЦК аховы здароўя, дык яны не знаходзяць там адказных работнікаў, да якіх прымацаваны. Апошнія ўхіляюцца ад сувязі і дапамогі вылучаным рабочым. ГарКК-РСІ рашуча папярэдзіла парт. і прафарганізацыі гэтых устаноў аб неабходнасьці зьнішчэньня падобных зьявішч, а ў выпадку паўтарэньня іх органы КК будуць бязьлітасна караць вінаватых.

Частка прадпрыемстваў усё яшчэ не разварушылася і бязьдзейнічае ў справе шэфства. На фабрыцы «Кастрычнік» дагэтуль ня вылучылі патрэбных 25 сацнамесьнікаў і ўсё абяцаюць «заўтра». Не адстае ад «Кастрычніка» і «Камунарка», якая ўсё яшчэ «вылучае і афармляе» кандыдатуры сацнамесьнікаў. На бліжэйшым пасяджэньні прэзыдыуму гарКК-РСІ ставіцца пытаньне аб бязьдзейнасьці і прыцягненьні да адказнасьці сакратароў парткалектываў паказаных прадпрыемстваў.

Шэфская работа над дзяржапаратам павінна быць наладжана ва што-б там ні стала.

Ф. Тамарына

ПАКТЫ І ФАКТЫ

(Манчжурыя пад ботам японскіх імпэрыялістаў)

Прайшло больш пяці дзён з пачатку японскага выступленьня ў Манчжурыі. Цяпер ужо ясна вырысоўваюцца апульныя контуры японскага пляну акупацыі ўсёй багатай манчжурскай краіны. Захоплены яе важнейшыя жыцьцёвыя цэнтры — сталіца Манчжурыі — Мукдэн — важны порт Аньдун, паўночная частка Бэйпін—Мукдэнскай чыгункі, а на поўначы — Гірынь і рад іншых стратэгічных пунктаў. У Мукдэне ўстаноўлена японскае ваеннае кіраўніцтва. Захват ня сустрэў фактычна ніякага супраціўленьня. Кітайскім салдатам быў даны загад праластавіць японцам свабоду дзеяньняў. Кітайскія газэты ў Манчжурыі сьцьвярджаюць (да рэчы, наперакор паведамленьням японскага камандаваньня), што з японскага боку ня было ні адной ахвяры.

Пакуль цяжка сказаць, ці спыніўся ўжо японскі імпэрыялізм у сваім прасоўваньні на поўнач. Ліберальная «Осака Асахі» нядаўна прадракала, што «калі Японія будзе вымушана прадпрыняць інтэрвэнцыю ў шырокім маштабе, кітайцы павінны будуць вінаваціць самі сябе». Газэта адкрыта прадракала пашыраньне японскай узброенай інтэрвэнцыі і замежы Манчжурыі.

Зараз, у сьвятле апошніх вестак, ужо ня прыходзіцца сумняваць у «праўдзівасьці» японскай вэрсіі адносна прычын выступленьня. Пастанова апошняга пасяджэньня савету міністраў заяўляе аб тым, што ўсе «нявырашаныя японска-кітайскія пытаньні павінны будуць атрымліваць сваё вырашэньне пры перагаворах з поводу цяперашняга канфлікту».

Савет міністраў, такім чынам, афіцыяльна прызнае, што цяперашні канфлікт будзе скарыстаны для націску на Кітай па ўсёй суме японскіх прэтэнзій у Манчжурыі і Манголіі.

Устаноўлена, апрача таго, што выступленьне японскіх часьцей адбывалася адначасова і ў Мукдэне і ў Чаньчуне. Такім чынам, вэрсія аб нападзе кітайскіх салдат на японскія часьці і зруйнаваньне кітайскімі салдатамі лініі ЮМ чыг. ніяк ня можа лічыцца прычынай выступленьня.

Цяперашняе японскае выступленьне падрыхтоўвалася на працягу некалькіх год. Японскі друк са дня ў дзень прапагандаваў думку аб пераважных правах Японіі ў Манчжурыі, а разам з тым і ў Манголіі. Гэта рабілася наперакор таму, што па вашынгтонскай канфэрэнцыі 1921-22 г. Японія пад націскам, галоўным чынам, ПАЗШ афіцыяльна адмовілася ад пераважных правоў на Манчжурыю.

Пытаньне аб «правах» Японіі ў Манголіі выклікала з боку кітайскай грамадзкасьці яшчэ большае раздражненьне, чым пытаньне аб Манчжурыі, бо калі Манчжурыя фактычна ў большай сваёй часьці ператварылася ўжо ў пляцдарм японскага імпэрыялізму, дык наконт Манголіі гэтага нельга яшчэ сказаць. Між тым, японскі друк прывык называць абедзьве краіны адным тэрмінам «Манчжура-Манголія», тым самым падкрэсьліваючы, што Японія прадстаўляе сабе сваё становішча ў Манголіі такім-жа, як і ў Манчжурыі.

За апошняе паўгодзьдзе японска-мукданскія адносіны ўзмоцнена і намерана абвастраліся на лініі падрыхтоўкі «актыўных дзеяньняў». Некалькі месяцаў таму назад, з прычыны прэзэнтацыі японскіх часьцей, у Манчжурыі разгрываецца славуты Ваньбаошаньскі інцыдэнт. Некалькі сотень кітайскіх сялян, справакаваных японскімі ўладамі, разбурылі ірыгацыйныя пабудовы карэйскіх пасяленцаў у раёне Ваньбаошаня — Гірынскай правінцыі. Японскія ўлады выступаюць «на абарону» пацярпеўшых. У японскім друку ўзьнімаецца надзвычайная шуміха і распальваюцца антыкітайскія настроі.

Гэта ўжо ня першы выпадак, калі японскія ўлады выступаюць у «абарону» карэйцаў. У Манчжурыі ёсьць каля мільёну карэйскіх пасяленцаў. Японскія ўлады ўсіляк перашкаджаюць таму, каб гэтыя карэйцы прынялі кітайскае падданства, бо, будучы японскімі грамадзянамі, яны служаць зручнай зброяй пры правядзеньні японскіх плянаў у Манчжурыі. І на гэты раз, пад лёзунгам абароны «сваіх грамадзян» японскі імпэрыялізм арганізуе па ўсёй Карэі грандыёзныя кітайскія пагромы. Ангельскі друк, дый ня толькі ангельскі, адкрыта сьцьвярджаў, што ў арганізацыі пагромаў нават вінавата японская паліцыя. Газэты ўказваюць, што інакш нельга было-б вытлумачыць, якім чынам у Карэі, дзе ў звычайны час забараняюцца ўсялякія «зборышчы» хаця-б двух карэйцаў, адбываюцца тысячныя дэманстрацыі і сярод белага дня руйнуюцца дамы і забіваюцца дзесяткі людзей.

Апошні этап у падрыхтоўцы да выступленьня — славутая справа аб забойстве японскага капітана — Накамура. Накамура быў забіты пры таемных умовах у адным з глухіх раёнаў унутраной Манголіі, які зьяўляецца пляцдармам замежнага, галоўным чынам, амэрыканскага капіталу. Японскі капітал у гэты раён старанна не дапускаўся. Першапачаткова кітайскія ўлады наогул адмаўлялі факт забойства. Рашучы тон японскага ўраду прымусіў Мукдэн апомніцца. Другая сьледчая камісія на справе Накамура неадкладна ўстанавіла вінаватага ў забойстве — камандзіра трэцяга палка гірынскіх войск. Забойца быў ужо на дарозе ў Мукдэн, куды ён ехаў па этапе. Аднак старанна́сьць мукдэнскіх улад на гэты раз не дапамагла. Японскі імпэрыялізм парашыў, што чакаць больш няма часу, што «чаша цярпеньня» перапоўнілася і акупацыя ўжо пачата...

Гісторыя ўзаемаадносін Японіі і Манчжурыі прадстаўляе сабой ланцуг бесьперапынных канфліктаў ужо на працягу амаль чатырох год. Чжан Цзо-лін, які прабаваў у апошнія гады свайго жыцьця процідзейнічаць плянам японскага ўкараненьня ў Манчжурыі, як вядома, загінуў пры выбуху цягніка каля сваёй уласнай рэзыдэнцыі — Мукдэна. Сын Чжан Цзо-ліна, Чжан Сюэ-лян працягваў у пэўнай ступені палітыку свайго бацькі, заахвочваючы кітайскае чыгуначнае будаўніцтва ў Манчжурыі, накіраванае да акружэньня японскай паўднёва-манчжурскай чыгункі сеткай паралельных веткі, якія павінны канкураваць з паўднёва-манчжурскай чыгункай. Але асабліва хваравіта Японія ўспрыняла тактычны манэўр Чжан Сюэ-ляна — прызнаньне ім нанкінскага ўраду ў якасьці цэнтральнага ўраду Кітая. З аднаго боку гэты факт зьяўляўся вусім відавочным узмацненьнем уплыву амэрыканскага капіталу, агентам якога пераважна зьяўляецца Нанкін. З другога боку, Чжан Сюэ-лян атрымаў фармальна повад ухіляцца ад задавальненьня японскіх патрабаваньняў, спасылаючыся на існаваньне «цэнтральнага» ўраду. І сапраўды, за апошнія год-два Чжан Сюэ-лян ня раз заяўляў прадстаўніком Японіі што ён самастойна «ня можа» вырашыць пытаньня аб чыгуначным будаўніцтве ў Манчжурыі, бо гэта ўваходзіць у компэтэнцыю «цэнтру».

Такая пастаноўка пытаньня, вядома, ніяк не задавольвала Японію. Неабходна ўспомніць, што амаль з трох мільярдаў іен, укладзеных у Кітай Японіяй, добрая доля — больш трох чвэртак — укладзена іменна ў Манчжурыю. Балянс замежнага гандлю Японіі ў вялізарнай ступені залежыць ад гандлю з Кітаем і апоў-такі ў асноўным — ад гандлю з Манчжурыяй. Ніякіх уступак у гэтым пытаньні на карысьць нанкінскага «цэнтру» Японія рабіць не магла.

Якія патрабаваньні будуць высунуты Японіяй у будучых японска-кітайскіх перагаворах?

У першую чаргу, Японія, бясспрэчна, будзе дабівацца вырашэньня пытаньня аб сканчэньні Гірынь-Хайрэнскай чыгункі, палова якой ужо пабудавана некалькі год таму назад. Гэта чыгунка, пры сваім сканчэньні, павінна даць новы выхад да мора для японскіх грузаў і тым самым разгрузіць другі японскі порт — Дайрэн, які ўжо не адказвае патрэбнасьцям краіны. Гірынь-Хайрэнская дарога павінна быць пабудавана паралельна ўсходняй лініі К.-У. чыгункі і мяркуецца як дарога, якая будзе канкураваць з апошняй. Гірынь-Хайрэнская чыгунка зьяўляецца паміж гэтага і надзвычай важным стратэгічным шляхам, які праклавае дарогу ў сэрца Гірынскай правінцыі. Другім патрабаваньнем Японіі зьявіцца аймаўленьне Мукдэну ад ажыцьцяўленьня плянаў кітайскага чыгуначнага будаўніцтва, што намячаюць рад новых чыгунак, якія будуць канкураваць з паўднёва-мукдэнскай чыгункай. Потым Японія, відавочна, патрабуе канчатковага падпарадкаваньня японскаму кантролю тых кітайскіх чыгунак, якія ўжо пабудаваны пры тым ці іншым удзеле японскага капіталу.

Наступнае важнейшае пытаньне, якое, бясспрэчна, будзе фігураваць у японскіх патрабаваньнях — гэта пытаньне аб свабодным гаспадараньні японскага гандлёвага капіталу ў Манчжурыі. Потым ідзе пытаньне аб праве дойтэрміновай арэнды і рад іншых.

Кітайскі друк, які выдаецца ў Манчжурыі, адзьвае выступленьне Японіі ў вельмі прымірыцельных тонах, што дае падставу думаць, што Японія ў сваіх патрабаваньнях, відавочна, ня сустрэне з боку кітайскіх улад сур'ёзнага супраціўленьня.

— Аднак на шляху Японіі ўстаюць вялізарнай важнасьці міжнародныя труднасьці. Няма ніякага сумненьня, што старое амэрыканскае супэрніцтва пры такім узмацненьні японскага ўплыву ў Манчжурыі павінна абвастрыцца. Пакуль пазыцыя ПАЗШ яшчэ ня ясная. З аднаго боку дзяржаўны дэпартамент ПАЗШ (міністэрства замежных спраў) заявіў, што выступленьне Японіі не парушае пакту Кэлога, тым самым як быццам-бы благаслаўляючы Японію на далейшыя акты і разам з тым зьдзекуючыся над пацыфісцкім творам свайго былога прэзыдэнта — Кэлога. Апошнія паведамленьні з ПАЗШ, аднак, паказваюць, што амэрыканскі ўрад магчыма «ўспомніць» Японіі аб існаваньні вашынгтонскай згоды, якая ўстанаўляе палітыку адчыненых дзьвярэй «у Кітаі» і згодна якой усе ўрады, якія падпісалі яе, у тым ліку і Японія, абавязваюцца не парушаць сувэрэнных правоў Кітая.

Захоўвае таямнічае маўчаньне тэксама і Англія. Праўда, за некалькі дзён да выступленьня Японіі ангельскі «Таймс» спачувальна заяўляў, што «цярпеньне Японіі кончылася».

У жэнэўскай газэтыльні — Лізе Нацыі — японскае выступленьне таксама было сустрэта «без супярэчнасьцяй». Сэсія савету Лігі «прыняла да ведама» заяву прадстаўніка Японіі аб тым, што японскі ўрад «прыме ўсе меры да папярэджаньня далейшага пагаршэньня канфлікту». Такім чынам, эўрапэйскія і заакіянскія «міратворцы», як быццам-бы, дагаварыліся аб тым, каб не перашкаджаць «цацярпеўшай» краіне — Японіі. Аднак, ясна, што ў абстаноўцы ўсё ўзрастаючага сусьветнага крызісу такое важнае пытаньне, як умацаваньне названый адной імпэрыялістычнай дзяржавы на важнейшым усходнім рынку, у Кітаі, ня можа ў далейшым ня выклікаць вялікага абвастрэньня імпэрыялістычных супярэчнасьцяй. Кітайскі друк падкрэсьлівае, што выступленьне Японіі ёсьць пачатак новай сусьветнай вайны.

Кітайскі пралетарыят лішні раз можа пераканацца, што блёк буржуазна-памешчыцкай рэакцыі, які ўяўляе, сабой нанкінскі ўрад, ні ў якай меры ня адольны аказаць хаця-б найменшае супраціўленьне прэтэнзіям міжнародных драпежнікаў.

Рабочыя-ж і сяляне Савецкага Саюзу з неаслабнай увагай будуць сачыць за разьвіцьцём падзей на Далёкім Усходзе, які ў другі раз за апошнія два гады ператвараецца ў ачаг ваеннай небясьпекі і магчымых антысавецкіх правакацый.

Сэзон скончылі з посьпехамі

Пад пагрозай вывазка

Пасьля зьмены апартуністычнага кіраўніцтва торфазаводу «Закрашынскі мох», апошні з посьпехам закончыў сэзон 1931 году.

Здабыта 13.264 тоны торфу, што складае 102,0 проц. гадавой праграмы. Высушана 80 проц. здабытых. Складзена ў штабелі 8.300 тон, альбо 61 проц.

Пад пагрозай вывозка торфу, таму, што заводы - спажыўцы торфяного апалу — ня прымаюць ніякіх захадаў да вываз.

Не распачата падрыхтоўка да сэзону 1932 году, таму што партыйная ячэйка і асабліва заўком у апошнія часы не займаюцца пытаньнямі далейшай работы заводу.

Старшыня заўкому Лукашэнка імкнецца падарваць работу дырэктара вылучанца-рабочага тав. Вырвіча, адмяніць яго распараджэньні і г. д.

Задача ЦП саюзу торфаскладаваньня прамысловасьці безадкладна ўмацаваць торфком заводу «Закрашынскі мох», ачысьціць апошні ад апартуністычных элементаў і ператварыць яго ў ударны.

„Бальшавік“ датэрмінова выканаў прамфінплян

„ГЕРАІЧНЫМІ НАМАГАНЬНЯМІ ЎДАРНІКАЎ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, МЫ ІДЗЕМ АД ПЕРАМОГІ ДА ПЕРАМОГІ“

Ленінскую „Правду“—у масы

Заваяваць 80-цітысячны тыраж „Правды“ у БССР

ЦК КП(б)Б яшчэ 15 ліпеня ў спецыяльнай дырэктыве, прапанаваў партыйным камітэтам і лічэйкам КП(б)Б разгарнуць шырокую работу вакол распаўсюджвання «Правды» у масы рабочых і калгаснікаў.

Лозунг «Нісоднага камуніста і камсамольца, перадавога рабочага і калгасніка без «Праўды» павінен быць ажыццёўлен, Белкалгасцэнтру і Белкаапсаюзу было прапанавана так арганізаваць работу па прасоўванні «Праўды», каб поўнасцю забяспечыць выкананьне дырэктывы ЦК. Кіраўніцтву сувязі было прапанавана перабудаваць масавацтыражную работу свайго апарату ў мэтах забяспячэньня росту тыражу «Праўды».

Значная частка партыйных арганізацый, органаў сувязі, спажывецкая сыстэма, многія прадпрыемствы БССР пабальшавіцку ўзяліся за ажыццяўленьне дырэктывы ЦК. Тыраж «Праўды» з 57.000 экз. у ліпені, вырас да 68.000 у верасьні. Рад раёнаў абсунуў сустрачныя планы, якія значна перавышаюць кантрольныя лічбы, і з посьпехам выконваюць іх. Тыраж «Праўды» у Бабруйскім раёне вырас у верасьні ў параўнаньні з ліпенем на 144,5 проц., у Чэрыкаўскім раёне—на 232,7 проц., у Стара-Дарожскім раёне—на 198,8 проц., у Слуцкім—на 144,3 проц., у Бялыніцкім—на 105 проц., у Сураскім—на 117,1 проц. і г. д.

Завод «Камунар» у Менску павялічыў тыраж «Праўды» з 65 экз. у ліпені да 230 экз. у верасьні (на 353,8 проц.).

Калгас «Прамень камуны» (Старобінскі раён) даў падпіску у 150 экз. пры 172 пісьменных калгасніках.

Віцебскае аддзяленьне «Беларускага аб'яднаньня гандлю культтаварамі» дало 200 новых чытачоў, шляхам распаўсюджваньня «Праўды» праз кніжныя крамы.

Але ёсьць раёны і паасобныя прадпрыемствы, якія ня выканалі нават мінімальнай лічбы і паслабілі тэмпы масавае-тыражнай работы. Гарадоцкі раён выканаў толькі 56,7 проц. заданьня, Менскі—76 проц., Старобінскі—74,8 проц., Сеньненскі—31,3 проц., Камарынскі—38 проц., Любаньскі — 56 проц. Фабрыка «Кастрычнік» (Менск) павінна была распаўсюдзіць 250 экз., аднак тыраж «Праўды» ў верасьні складае толькі 235 экз. Завод «Дрэвапрацоўшчык» замест 150 экз., распаўсюджвае 77. Завод «Энэргія» замест 200 экз.—46 экз. і г. д.

Рад парткалектываў і ячэек не абгаварвалі на агульных сходах пытаньняў аб прасоўваньні «Праўды» ў шырокія копы рабочых і калгаснікаў. Упадываваныя ячэек «Праўды», якія павінны былі праводзіць самую шырокую работу па павялічэньні тыражу, часта слаба выконвалі даручанае ім заданьне.

Белкалгасцэнтр і Белкаапсаюз не праверылі выкананьня сваіх паказаньняў па пытаньні прасоўваньня «Праўды».

У КАСТРЫЧНІКУ ТЫРАЖ «ЛЕНІНСКАЙ ПРАЎДЫ» ПА БССР ПАВІНЕН ДАСЯГНУЦЬ 80.000 ЭКЗ. Выканаць гэта заданьне—абавязак ня толькі распаўсюджвальных арганізацый, але ўсіх партыйных, прафэсыянальных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый, перадавых рабочых і калгаснікаў.

Кіраўніцтву сувязі трэба так пабудаваць работу, каб ніякія прычыны не перашкаджалі пашырэньню «Праўды» і своечасовай дастаўцы яе падпісчыкам на дом. Бюро ГК, РК і ячэек КП(б)Б павінны пэрыядычна заслухоўваць справаздачы ўпаўнаважаных ячэек «Праўды», загадчыкаў райсувязі, старшынь райсаюзаў і райкаапсаюзаў аб ходзе работы па пашырэньні падпіскі на «Праўду» і забяспечыць акуратную і своечасовую дастаўку яе.

С. БАБРОЎСКІ.

Аб удзеле камуністаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве на вытворчасьці

Пастанова прэзыдыуму і парткалегіі ЦКК КП(б)Б

1. Праверка ўдзелу камуністаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве паказвае, што камуністы на вытворчасьці ў асноўным знаходзяцца на перадавых пазыцыях барацьбы за прамфінплян, стаць на чале творчага энтузіязму рабочых мас, паказваюць узоры гераічнай ударнай работы і выяўляюцца ініцыятарамі рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

2. Нябывалы рост энтузіязму рабочай клясы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, які выявіўся ў арганізацыі сацыялістычных форм работы ў выглядзе сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сустрачных прамфінпляноў, вытворчых манэўраў даў магчымасьць забяспечыць выкананьне пляноў трэцяга рашаючага году пяцігодкі многімі фабрыкамі і заводамі. Праверка паказала, што выкананьне прамфінпляну знаходзіцца ў поўнай сувязі і залежыць галоўным чынам ад разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. На тых прадпрыемствах, дзе камуністы поўнасцю ахоплены сацспаборніцтвам і сталі на чале руху рабочых мас,—там вытворчая праграма пасьпяхова выконваецца і перавыконваецца (завод «Бальшавік» і інш.).

Існуючае недавыкананьне прамфінпляну па радзе прадпрыемстваў зьяўляецца вынікам нездаральнічэньня ўдзелу камуністаў і камсамольцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве, наўменьшэньня арганізаваць актыўнасьць рабочых мас і стаць на чале іх вытворчага ўздыму.

Прэзыдыум і парткалегія ЦКК КП(б)Б лічаць зусім недапушчальным, калі на паасобных прадпрыемствах удзел камуністаў і камсамольцаў ва ўдарным руху дасягае толькі 65-70 проц., а па некаторых нават ніжэй (фабрыка «Дзьвіна»—49 проц., імя Лекерта—44 проц., у Віцебску «Чырвоны адраджэнец» — 42 проц., у Магілеве, чыгунка Жлобін—61 проц.—па 1/VI 1931 г.). Гэта зьявілася асноўнай прычынай сур'ёзьнейшых прарываў у выкананьні пляну на паказаных прадпрыемствах.

3. Недапушчальным таксама зьяўляецца па радзе прадпрыемстваў слабы ўдзел камуністаў у рабоце вытворчых нарад і рацыяналізацыі вытворчасьці (скуравод імя Сталіна), і зусім недапушчальным зьяўляюцца выкрыты ў працэсе праверкі паасобныя факты ліквідацыі ударнікамі, што ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НЕСУМЯШЧАЛЬНЫМ СА ЗВАНЬНЕМ КАМУНІСТА.

4. Асноўнымі прычынамі такіх адмоўных зьяўлеішч зьяўляецца адсутнасьць систематычнай выхаваўчай работы з боку фабрычна-заводзкіх ячэек, парткалектываў і парткомаў у напрамку штодзённай мабілізацыі ўвагі ўсіх партыйцаў, камсамольцаў і рабочых на выкананьне вытворчых задач данай фабрыкі і заводу, на ўзначаленьне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і систематычнай праверкі выкананьня кожным камуністам сваіх абавязкаў.

5. Прэзыдыум і парткалегія ЦКК КП(б)Б катэгарычна папярэджваюць усіх камуністаў, што іх партыйнасьць будзе расцэньвацца ў залежнасьці ад таго, наколькі кожны камуніст прымае актыўны ўдзел у сацыялістычных формах працы, наколькі ён праяўляе ініцыятыву, настойлівасьць і дысцыпліністасьць па выкананьні баявых заданьняў партыі і стаць на чале актыўнасьці рабочых мас.

6. Прэзыдыум і Парткалегія ЦКК КП(б)Б асабліва падкрэсьліваюць важнасьць сапраўднага актыўнага ўдзелу ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве камуністаў-гаспадарнікаў (дырэктароў, намочнікаў, майстроў), інжынэрна-тэхнічнага персаналу і прапаўленьне з іх боку чулага адышоду да рэалізацыі рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў, вынаходзтва ініцыятарскіх на вытворчасьці, на выкананьне кольканых і пасёвных паказальнікаў, на выкананьне прамфінпляну.

7. Прэзыдыум і Парткалегія ЦКК КП(б)Б прапануюць усім партарганізацыям, Райкомам і РКК, ячэйкам дабіцца ў самы кароткі тэрмін ажыццяўленьня дырэктыў XVI зьезду партыі аб паглыбленым удзеле камуністаў і камсамольцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Неабходна, каб камуністы на вытворчасьці не абмяжоўваліся толькі ўдзелам ва ўдарных брыгадах, з былі арганізатарамі ўдарных брыгад, застрэльшчыкамі сустрачных пляноў і рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па вытворчасьці, перадавымі ва ўсім грамадзкім жыцьці прадпрыемстваў, вярбоўшчыкамі перадавых рабочых - ударнікаў у партыю. Прэзыдыум і Парткалегія ЦКК КП(б)В, надаючы важнейшае палітычнае значэньне пераводу ўдарных брыгад на гаспадарчы разрахунак, прапануюць фабрычна-заводзкім партарганізацыям неадкладна разгарнуць работу па мабілізацыі рабочых мас вакол гэтага важнейшага мерапрыемства партыі і прафсаюзаў (апублікавана ў «Правде» за 12 верасьня 1931 г.).

8. Райкомам, РКК, партячэйкам неабходна перабудаваць сваю працу па-новаму, каб ня толькі займацца канстатаваньнем маючых месца прарываў на вытворчасьці (прагулы, брак, зьніжэньне якасьці, невыкананьне прамфінпляну) і прыняцьця тых ці іншых рапрасыўных мер, а штодзенна мабілізоўваць і стаць на чале шырокіх мас партыйцаў і беспартыйных рабочых на ліквідацыю абязьлічкі, поўную рэалізацыю прапаноў т. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, не дапускаючы прарываў на рабоце, на вытворчасьці, расхлябанасьці і ўхіленьня членаў партыі ад баявых заданьняў.

9. Прэзыдыум і Парткалегія ЦКК КП(б)Б прапануюць усім Гаркомам, парткалектывам і ячэйкам даную пастанову прапрацаваць на адкрытых сходах ячэек, мабілізаваўшы ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі і рабочай клясы на поўнае выкананьне пляну 3-та рашаючага году пяцігодкі, ад яго залежыць пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за 4 гады.

Адначасова лічыць неабходным прыступіць да абсьледваньня ўдзелу камуністаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Гэтую пастанову зьмясьціць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б КАЛНІН.
Сакратар парткалегіі ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

Ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна—вось адзіны шлях да посьпехаў

135 рабочых прапаноў, брыгаднае і індывідуальнае сацспаборніцтва, штодзеннае зьменна—сустрэчнае плянаваньне, гаспадарчы разрахунак, работа з вядучымі прафэсіямі, вытворчыя манэўры, уцягненьне лепшых ударнікаў у партыю—вось формы і мэтады масавай работы „Бальшавіка“

ВУЧЭЦЦЕСЯ У „БАЛЬШАВІКА“ ПЕРАМАГАЦЬ

РАПАРТ ЦК КП(б)Б

ад рабочых, работніц, інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў і служачых чырвонасьцяжнага заводу „Бальшавік“

Гераічнымі намаганьнямі ўсяго калектыву ўдарнікаў заводу, гэтых лепшых барацьбітоў за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі ленінскай камуністычнай партыі, мы ідзем ад перамогі да перамогі на фронце будаўніцтва сацыялізму.

26 IX МЫ ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЛІ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ПАВЯЛІЧАНАЙ ПРАГРАМЫ (на 32,7 проц. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем) ТРЭЦЯГА КВАРТАЛУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ Ў КОЛЬКАСНЫМ НА 101,15 І Ў ЦЭННАСНЫМ НА 105,33 ПРОЦ.

Калектыў ударнікаў, ахоплены энтузіязмам, даказаў, што ён з гонарам можа змагацца за выкананьне і перавыкананьне сацыялістычных пляноў будаўніцтва. Замест вызначанага бюро партканкетыву і заўкомам тэрміну —27-IX, МЫ ВЫКАНАЛІ ПРАГРАМУ 26/IX.

Гэтыя перамогі не выпадковыя. Гэта—вынікі штодзённай мабілізацыі мас на выкананьне задач будаўніцтва сацыялізму, гэта вынік правільнага кіраўніцтва партарганізацыі, гэта вынік высокай сьвядомасьці калектыву ўдарнікаў заводу.

НА ПАДСТАВЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ 6-ЦІ УМОЎ ТАВ. СТАЛІНА мы дабіліся вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах нашай работы. У галіне зьніжэньня сабекошту ў трэцім квартале мы далі 12,65 проц. замест плянавага 5,9 проц.

За 3-ці квартал паступіла 135 рабочых прапаноў, якія даюць каля 6.000 руб. эканоміі.

Якасьць прадукцыі ў нас паляпшаецца.

Прагулы за трэці квартал складаюць 0,09 проц. супроць 0,17 проц. у першым пайгодзьдзі.

Сацспаборніцтва у нас ахоплена 92,1 проц. рабочых, замест 86,6 проц. на 1/VII-31 г. ПА 23-х БРЫГАДАХ ПРАВОДЗЯЦЦА ЗЬМЕННА-СУСТРЭЧНЫЯ 10-ЦІХВІЛІННЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ НАРАДЫ. Усе аддзяленьні пераведзены на гаспадарчы разрахунак. 12 БРЫГАД ВЯЎ ПРАФЭСІЙ ТАКСАМА ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК Гэтыя брыгады адыгрываюць пе радавую ролю на вытворчасьці і выяўляюцца прыкладам для ўсіх астатніх брыгад.

Мы ўсе мерапрыемствы цесна ўвязваем з выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну.

Вакол манэўраў СПА мы разгарнулі вялізарную агітмасавую работу. Побач з гэтымі манэўрамі мы абвясьцілі ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ на датэрміновае выкананьне прамфінпляну трэцяга кварталу, на ўцягненьне ў партыю лепшых ударнікаў і ўключэньніся ва ўсесаюзны конкурс на лепшае скур-абутковае прадпрыемства па выкананьні прамфінпляну другога паўгодзьдзя трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Праведзеныя зборы каманды СПА аб'екту паказваюць, што мы гатовы па першым закліку партыі і савецкай улады адбіць напад ворагаў, якія паспрабуюць перашкодзіць нам пасьпяхова будаваць сацыялізм. ЗБОРЫ ПАКАЗАЛІ СЬВЯДОМАСЬЦЬ НАШЫХ БАЙЦОЎ, ІХ БАЯВУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ І ДАКАЗВАЮЦЬ ДОБРА ПРАВЕДЗЕНУЮ ПАЛІТЫЧНА-МАСАВУЮ РАБОТУ ВАКОЛ МАНЭЎРАЎ.

За час манэўраў 39 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў рады партыі, а за ўвесь трэці квартал—57 УДАРНІКАЎ УСТУПІЛІ Ў ПАРТЫЮ. Больш 50 проц. з іх маюць дарэвалюцыйны вытворчы стаж і 36 проц. маюць больш чым 5 гадовы вытворчы стаж. У камсамол уступіла за час манэўраў 14 чал., а за ўвесь трэці квартал—36 чал.

Намі пасьпяхова праведзена кампанія па рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы год пяцігодкі»—100 проц. рабочых, ІТР і служачых, якія працавалі ў той час на заводзе, ахоплены працу па ахопе новавядзем штодзённую пазыкай. Цэлар мы ВЫДАЛІ ЯШЧЭ 51 РАБОЧАГА НА СУМУ 4233 РУБ. Гэту работу мы будзем яшчэ працягваць.

Нам вядома, што без перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад, мы ня здолаем пасьпяхова рушыцца наперад і ўдарнікі нашага заводу правялі ў падшэфных нам сельсаветах Самахвалавіцкім і Гатаўскім вялізарнейшую работу. Было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва паміж імі на лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі, зяблевай і асеньняй посеўнай кампаніі, на большы ахоп калектывізацыяй. Мы вызначылі пераходны сьцяг для перадачы яго лепшаму сельсавету і ўжо разгарнулі работу па падвядзеньні вынікаў сацспаборніцтва паміж сельсаветамі. Выезды нашых ударнікаў у сельсаветы мелі мэтай перадачу нашых мэтадаў перамогі на вытворчым фронце мэтадаў барацьбы, мэтадаў перамогі на вытворчым фронце для ўжыцьця іх у пасьпяховай перабудове сельскай гаспадаркі.

Нам вядома, што разгорнутае наступленьне сацыялізму як у горадзе, так і на вёсцы на рэшткі капіталістычных элементаў СССР нямінуча выклікае шалёнае супраціўленьне ўсіх ворагаў рабочай клясы як унутры СССР, так і ў акружаючых нас капіталістычных краінах.

Адгэтуль і абвастраньне клясавай барацьбы ў краіне.

Галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца імкненьне ўсіх ворагаў рабочай клясы дабіцца зьніжэньня тэмпаў будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Калектыў ударнікаў чырвонаштандарнага скуразаводу «Бальшавік», пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі, увесь час вядзе ўпартую барацьбу з усякімі праявамі як правага, так і «лева» апартунізму і, ТОЛЬКІ НА ПАДСТАВЕ ПРАВІЛЬНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, МЫ З КВАРТАЛУ Ў КВАРТАЛ ПЕРАВЫКОНВАЕМ СВОЙ ПРАМФІНПЛЯН.

Задачы, якія зараз стаяць перад намі, гэта зьнішчыць усе недахопы ў нашай працы, дабіцца давядзеньня прагулаў да нуля, змагацца за паляпшэньне якасьці прадукцыі, змагацца за перамогу на ўсесаюзным конкурсе на лепшае прадпрыемства скурана-абутковай прамысловасьці.

Мы памятаем словы тав. Молатава: «МЕНШ ХВАСТУНСТВА, БОЛЬШ САПРАЎДНАЙ ГАТОЎНАСЬЦІ ДА БАРАЦЬБЫ ЗА ТЭМПЫ».

Мы ня спыняемся на дасягнутых посьпехах, мы будзем яшчэ больш змагацца за павялічэньне тэмпаў, за зьнішчэньне ўсіх недахопаў у нашай рабоце.

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ УДАРНІКІ—САПРАЎДНЫЯ БАРАЦЬБІТЫ ЗА САЦЫЯЛІЗМ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ—АРГАНІЗАТАР І КІРАЎНІК ПЕРАМОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ Ў НАШАЙ КРАІНЕ І ЯЕ ПРАВАДЫР ТАВ. СТАЛІН!

Ад імя калектыву заводу:
Сакратар бюро парткалектыву зав. «Бальшавік» ГЕЛЕР.
Старшыня заўкому КАНТАРОВІЧ.
Дырэктар заводу БАНДАРЧЫК.

„Пра такую пастанову ня чулі...“

КАПЫЛЬ. Брыгада сельскораў «Калгасьніка Капыльшчыны» праверыла становішча рабочых сталовак Капыля. Брыгадай выяўлены рад фактаў безгаспадарчасьці, бездакназнасьці за работу, бесплянавасьці, адсутнасьці ўсякага ўліку ў выдачы і прыёмцы прадуктаў. Гародніной сталоўкі зусім слаба забясьпечаны, тады, як яшчэ і зараз ёсьць магчымасьць загатовіць гародніну на мясцовым рынку.

Зусім адсутнічае кіраўніцтва і нагляд за сталоўкай з боку сельспажыўтаварыства і інструктара па грамадзкім харчаваньні.

Нормы выдачы прадуктаў на чалавека і па катэгорыям няма. Пастанова ЦК партыі аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня не распрацавана. Загадчык сталоўкі №2 кажа: «Аб гэтай пастанове ня ведаю і ніколі яе не бачыў».

Вытворчая камісія пры сталоўцы ня створана. На зьдзельшчыну і гаспадарчы разрахунак сталоўкі не пераведзены, новыя формы і мэтады працы сацспаборніцтва і ўдарніцтва адсутнічаюць.

Санітарна - гігіенічнае становішча зусім дрэннае. Ручнікамі для начыньня сталоўкі не забясьпечаны. Прадукты з буфэту—цукеркі, гуркі і інш. выдаюцца брудзнымі рукамі. Хавальні сталовак забруджаны. Мэдагляду ніколі ня бывае.

Адкіды сталовак не скарыстоўваюцца. На адкідах можна ўтрымоўваць мінімум 8—10 сьвіней, а ўтрымоўваюцца толькі 3.

Трэба ў бліжэйшы час на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, рашуча перабудаваць работу сталовак. Трэба шырока разгарнуць масавую работу, мабілізаваўшы ўвагу вакол пытаньняў паляпшэньня працы сталовак.

Брыгада: БАРЭВАЦКІ, РАМАНОЎСКАЯ, ЯРАШУК.

9.000 РАБОЧЫХ—ДАНБАСУ

Засталіся два дні

ІО РАЁНАЎ З ГОНАРАМ ВЫКАНАЛІ І ПЕРАВЫКАНАЛІ СВАЕ ЗАДАНЬНІ

Стара-Дарожскі, Быхаўскі, Лагойскі, Брагінскі і Чырвона-Слабодзкі раёны не далі яшчэ ні аднаго чалавека

Патрабуем ад пракурора рэспублікі неадкладнага прыцяненьня вінаватых да адказнасьці

Адпраўка адыходнікаў у Данбас на 25-га верасьня

У ПРОЦАНТАХ ПА РАЁНАХ

Кармянскі	210
Касьцюковіцкі	151
Гарадоцкі	135
Крупскі	134
Ельскі	124
Лёзьнянскі	115
Бярэзінскі	108
Чэрыкаўскі	106
Чырвонапольскі	100
Бялыніцкі	100
Лепельскі	97
Жлобінскі	90
Рагачоўскі	85
Крычаўскі	79
Плешчаніцкі	79
Чавускі	78
Уваровіцкі	75
Клімавіцкі	75
Хойніцкі	75
Чашніцкі	73
Лоеўскі	72
Талачынскі	66
Сеньненскі	81
Чачэрскі	60
Глускі	48
Клічаўскі	47
Рэчыцкі	46
Шклоўскі	45
Горацкі	45
Бешанковіцкі	43
Нараўлянскі	39
Камарынскі	38
Сіроцінскі	37
Вягомльскі	34
Сураскі	34
Ветка ўскі	32
Мсьціслаўскі	31
Койданаўскі	20
Церахаўскі	18
Капыльскі	11
Буда-Кашалёўскі	7
Пухавіцкі	8
Пухавіцкі	7
Старобінскі	4
Стара-Дарожскі	0
Лагойскі	0
Быхаўскі	0
Брагінскі	0
Чырвона-Слабодзкі	0

Усяго разам — 66,2 проц. заданьня.



Вываз вугля

У шахце.

Рэйд брыгад „Зьвязды“ „ІВіцебскага пралетара“

Пасьля месячніка—заціішша

Рад парт'ячэек віцебскіх прадпрыемстваў і ўстаноў ігнаруюць пастановы ЦК і гаркому КП(б)Б аб беларусізацыі

Зламаць супраціўленьне вялікадзяржаўнікаў, разгарнуць баявую работу па рэалізацыі дырэктыў Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Выходзячы з ацэнкі бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб глыбокім прарыве ў рабоце віцебскай арганізацыі па правядзеньні ленінскай нац. палітыкі пленум Віцебскага гаркому КП(б)Б, які адбыўся ў канцы ліпеня, вызначыў і прапанаваў арганізацыям правесьці ў жыцьцё рад канкрэтных мерапрыемстваў у гэтай галіне.

Як-жа рэалізацыя пастановы ЦК і гаркому партыі? Ці ўзьнята работа на правядзеньні ленінскай нацпалітыкі на належную вышыню?

Правядзены рэйд «Зьвязды» і «Віцебскага пралетара» паказвае, што нізавыя партарганізацыі яшчэ не забясьпечылі няўхільнае ажыцьцяўленьне пастановаў гаркому, што прарыў у гэтым пытаньні існуе і да гэтага часу.

Вось факты:

Партарганізацыя **акулярнай фабрыкі** ігнаруе пастанову гаркому партыі аб стварэньні чатырох гурткоў па вывучэньні беларускай мовы, і да гэтага часу гурткі не арганізаваны. Партыйцы і камсамольцы не зьяўляюцца застрэльшчыкамі ў справе аўладаньня беларускай. Большай часткай рабочых беларуская мова ня ўжываецца. Служачыя гавораць выключна па-расійску. Шматтыражка і насьценгазэты зусім слаба мабілізуюць рабочых на барацьбу з адхіленьнямі ад лініі партыі ў нацпытаньні. На фабрыцы ёсьць шмат **вылазак вялікадзяржаўнага шавінізму і антысэмітызму.**

На фабрыцы **«Дзьвіна»**, дзе працуе **1.878** беларусоў і шмат рабочых іншых нацыянальнасьцяй, нацпытаньне зусім закінута. Пастанова гаркому партыі аб стварэньні 6-ці гурткоў па вывучэньні беларускай мовы злосна ігнаруецца, і да гэтага часу ніводнага гуртка па вывучэньні беларускай мовы не створана. Ніякай растлумачальнай работы аб значэньні ленінскай нацпалітыкі не праводзіцца.

На прадпрыемствах **камунальнага трэсту** малюнак таксама ня лепшы. Беларускую мову тут ня ўжываюць. Старшыня групкому — член партыі тав. **Ягораў**, які хоць і ведае беларускую, але заўсёды гаворыць на сходах толькі па-расійску.

Работнікі камунальнага трэсту **Сіняўскі** і **Крыжаўскі** гавораць з рабочымі-беларусамі выключна па-расійску, матывуючы, што «беларуская будзе незразумела».

Пастановай нацкамісіі, за супраціўленьне ў правядзеньні беларусізацыі, работнік камтрасту **Дылядовіч** павінен быў **быць зьнят з работы**, але апошні да гэтага часу яшчэ працуе.

Па Камтрэсьце налічваецца 1.000 рабочых і служачых. Большасьць з іх беларусы, але да гэтага часу ніводнага гуртка па вывучэньні беларускай мовы не арганізавана.

На грузкоме **Белэнэргіі** была вызвана вялікадзяржаўнага шавініста-тэхніка Яўдакімава.

Партыйная ячэйка і прафарганізацыя гэтай клясава-варожай вылазкі не асудзілі і вялікадзяржаўніку не далі рашучага адпору.

Беларускія і нацменаўскія газэты распаўсюджваюцца вельмі дрэнна. На 100 рабочых-яўрэяў выпісваецца толькі 2 яўрэйскія газэты і 40 экз. «Зьвязды».

Правядзеньне нацпалітыкі зьяўляецца адным з вузкіх месц і на заводзе **«Чырвоны металіст»**. У ліпені на заводзе былі арганізаваны гурткі па вывучэньні беларускай мовы, але з прычыны апартуністычных адносін да іх работы, апошнія развяліся.

Беларуская мова ў практычнай рабоце ня ўжываецца. Партыйцы і камсамольцы не паказваюць прыкладу.

На заводзе выпускаецца шматтыражка і насьценгазэта, але яны не мабілізуюць масы на зьнішчэньне прарываў у галіне нацкультбудаўніцтва. У газэтах няма старонак на польскай і яўрэйскай мовах ня гледзячы на тое, што на заводзе ёсьць шмат рабочых гэтых нацыянальнасьцяй.

Яшчэ горш стаіць справа ў ФЗВ мэталістаў, дзе ўсе дысьцыпліны выкладаюцца выключна на расійскай мове. Асабліва супраціўляецца выкладаньню на беларускай выкладчык Муратаў, але і гэты вялікадзяржаўны шавініст не атрымаў адпору.

Грамадзкія арганізацыі гарсавету да гэтага часу не ўзяліся за рэалізацыю пастановы гаркому партыі па ўкараненьні беларускай мовы сярод сваіх работнікаў.

Ня выконваюць пастановы нацкамісіі аб зьняцьці з работы служачых за ігнараваньне беларускай мовы.

Пералому ў справе ўжываньня беларускай мовы в боку тых, хто атрымаў спагнаньне, таксама няма. Апошнія да пастановы нацкамісіі адносяцца па-палівацельску.

Такое-ж становішча мы маем і ва ўстановах **нарсувязі**, **бальніцы імя Леніна**. У апошняй доктар Беленькі ў прысутнасьці брыгады заявіў: **«нам мэдыкам, беларуская непатрэбна».**

Усе гэтыя факты зусім выразна сыгналізуюць аб апартуністычных адносінах асобных партыйцаў і прафарганізацый Віцебшчыны да пастановы гаркому партыі аб правядзеньні ленінскай нацпалітыкі, асабліва ў галіне ўкараненьня беларускай мовы сярод шырокіх мас рабочых.

Брыгада «Зьвязды» і «Віцебскага пралетара»: Тарасаў, Хартон, Новікаў, Катляроў, Рубінчык, Антонаў, Жураўскі, Пачыновіч, Жытамірская, Шабуневіч, Мацкевіч, Карасева, Грышко, Грыбштэйн, Філіпаў, Брук, Крэпнік і Пісарава.

Мабілізацыя сродкаў

Да 1-га кастрычніка

СКОНЧЫЦЬ АФАРМЛЕНЬНЕ ПАДПІСКІ НА ПАЗЫКУ

ДА АДКАЗНАСЬЦІ—КІРАЎНІКОЎ УСТАНОЎ, ЯКІЯ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ УЗНОСЫ ПА ПАЗЫЦЫ

Апошняя дэкада не дала належнага перапому ў афармленьні падпіскі.

На 20 верасьня з агульнай сумы рэалізаванай пазыкі па БССР у 36.778 тыс. афармлена толькі 27.051 тыс., або 77,9 проц. Па асобных групах афармленьне пазыкі праходзіць наступным чынам: па групе рабочых, служачых і інш. гарадзкога насельніцтва — 85,4 проц., па калгасах—40,1 проц.

Яшчэ горш праходзіць як рэалізацыя, так і афармленьне пазыкі па аднаасобным сэктары. Кантрольнае заданьне па гэтай групе выканана толькі на 28 проц.

Рад раёнаў, дзе вакол кампаніі была створана грамадзкая думка, дзе раённыя арганізацыі напежным чынам кіравалі гэтай работай, дабіліся значных посьпехаў як у рэалізацыі, так і ў афармленьні пазыкі. Так, КЛІЧАЎСКІ РАЁН на 20 верасьня выканаў кантрольнае заданьне па рэалізацыі на 133 проц. Падпіска афармлена на ўсе 100 проц. ГОМЕЛЬСКІ РАЁН аформіў падпіску сярод рабочых і служачых на 90 проц., па калгасным сэктары на 100 проц.

Але многія раёны недаацанілі палітычнай важнасьці пасьпяховага замацаваньня дасягнутых посьпехаў пры падпісцы пазыкі, і афармленьне праходзіць самацёкам. Апошняя дэкада дала зьніжэньне падпіскі па групе рабочых і служачых у МАГІЛЕЎСКІМ РАЁНЕ на 72.000 руб. Ва ЎВАРАВІЦКІМ РАЁНЕ падпіска зьменшылася, параўнальна з мінулай дэкадай, на 95.000 руб., у Касьцюковічах—на 20.000 руб. Прычыны — блытаніна ва ўліку і агіднае «очковтирательство»

У ДРЫСЕНСКІМ РАЁНЕ рэалізацыя пазыкі праходзіла самацёкам, бяз усякага ўдзелу мясцовых арганізацый. У выніку высьветлілася, што дрысенскія арганізацыі займаліся «очковтирательством», даючы ляўна няправільныя весткі аб ходзе падпіскі. Апошняя дэкада дала зьмяншэньне сумы падпіскі на 145.000 руб.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі названых раёнаў не замацавалі ўздыму энтузіязму рабочых у часе рэалізацыі пазыкі. За апошні час масавая работа вакол пазыкі зусім спынілася.

Ёсьць рад выпадкаў, калі паасобныя арганізацыі на прадпрыемствах і ўстановах не зварачаюць увагі на ахоп падпіскай новых рабочых і служачых. У выніку МЫ ЎСЁ ЯШЧЭ МАЕМ ЗНАЧНУЮ ГРУПУ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ, ЯКІЯ НЕ АХОПЛЕНЫ ПАДПІСКАЙ.

Грамадзкія арганізацыі: МОПР, Аўтадор, Асоавіяхім, Чырвоны крыж, «Прачняпісьменнасьць» узялі на сябе абавязак распаўсюджваць пазыку сярод аднаасобнікаў. Гэтыя абавязкі названымі арганізацыямі ажыцьцяўляюцца вельмі слаба. Крэдытна-фінансавыя установы не дапамагалі гэтым арганізацыям разгарнуць работу.

З 25-га верасьня абвешчан масавы паход за поўнае афармленьне падпіскі. На сёнешні дзень раённыя арганізацыі яшчэ не мабілізавалі шырокія масы працоўных вакол паходу.

Раённыя арганізацыі павінны ў бліжэйшы-жа час разгарнуць шырокую палітычна-масавую работу вакол кампаніі афармленьня падпіскі.

Н.

Збор самаабкладаньня яшчэ не пачаўся

ВУЗДА. Па Каменскім сельсавеце мабілізацыя сродкаў праходзіць самацёкам. Парт'ячэйка гэтым пытаньнем не займаецца. На сёнешні дзень па плацяжох 1-га тэрміну падатку і страхоўкі паступіла толькі 60 проц., у той час, калі тэрмін даўно прайшоў. Самаабкладаньне толькі цяпер закончана. Пазыка «трэцяга рашаючага» па аднаасобным сэктары распаўсюджана толькі на 400 рублёў.

С. ЯРМАК.

Вушачы і Чашнікі зрываюць выкананьне фінпляну

(З пастановы СНК БССР)

Саўнарком БССР, заслухаўшы даклады Вушацкага і Чашніцкага РВК, аб ходзе выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва, прызнаў работу гэтых райвыканкомаў незадавальняючай.

Вушацкі раён выканаў плян першага кварталу на 58 проц., 2-га кварталу на 50,8 проц. Чашніцкі раён плян першага кварталу выкан

ЖЫЦЬЦЕ 10.000 ЗЬНЯВОЛЕНЫХ БРАТОУ пад ПАГРОЗАЙ

Сьвет працы палае пратэстам супроць зьверства польскіх палкоўнікаў катаў і турэмшчыкаў

Калгасьнікі Савецкай краіны дэманструюць сваю салідарнасьць з гераічнымі змагарамі і гарачай нянавісьцю адказваюць забойцам

Калгасьнікі калгасу «Лепшая доля» (Лагойскі раён) прыслалі нам наступную рэзалюцыю свайго агульнага сходу:

«Дзесяць тысяч рэвалюцыйных рабочых і сялян дыктатура фашызму закавала ў кайданы і кінула ў сырыя лёхі польскіх шлісэльбургаў. Але гэтым не задавальняюцца крывавыя дзяржымморды сучаснай Польшчы.

Да нас даходзяць жудасныя весткі аб тым, што над жыцьцём дзесяці тысяч зьняволеных братоў павісла пагроза. Азьвярэлы фашызм увёў у сваіх турмах закон, якога яшчэ ня ведала гісторыя. Ён пазбавіў палітвязьняў правоў, здабытых дзесяткамі год барацьбы палітычных катаржнікаў царскіх турмаў, пазбавіў правоў, на якія не адважалася рабіць замах нават самая чорная рэакцыя царскай Расіі.

Кроў ледзянее ў жылах, калі ўявіць сабе, што дзесяць тысяч лепшых людзей эпохі зраўнаны ў правах з крымінальнымі злачынцамі. Перавод палітычных вязьняў на крымінальны рэжым зьяўляецца фактычна асуджэньнем іх на паступовае вывіраньне. Новы турэмны рэгламант разьвязвае рукі турэмным садыстам. Польскія турмы з поршага-ж дня дзейнасьці фашысцкага рэгляменту ператварыліся ў крывавыя дамы зьдзекаў і панявераў.

Стогны паміраючых рэвалюцыянэраў нясуцца з-за турэмных кратаў польскіх турмаў і клічуць рабоча-сяляцкія масы Польшчы і ўсяго сьвету на дапамогу.

Падаючы нянавісьцю да польскіх фашыстаў — інквізытараў XX веку — мы, калгасьнікі «Лепшай долі», з гнеўам і абурэньнем пратэстуем супроць увядзеньня новага турэмнага рэгляменту і дамагаемся вярнуць палітычным вязьням іх, здабытыя крыёю правы.

Вестка аб усеагульнай галадоўцы палоньнікаў польскага фашызму спатнала сярод нас брацкае спачуваньне. Галадоўка — апошняя зброя зьняволеных — можа быць зброяй толькі загартаваных і рашучых. Мы вітаем вашу гераічную барацьбу таварышы палітвязьні, і шлем вам, як канкрэтную дапамогу, 215 рублёў.

У адказ крывавай бандзе генэралаў і палкоўнікаў — катам Польшчы — мы будзем і надалей па-бальшавіцку змагацца за выкананьне і перавыкананьне пляноў асеньняй сяўбы, сілаваньня і збожжазагатовак, за суцэльную калектывізацыю.

Дарагія браты, рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі! Рыхтуйцеся да рашаючых баёў з дыктатурай катаў, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, за будаўніцтва сацыялізму разам з намі.

Няхай ведаюць паны-пілсудчыкі і іх агенты, што 150-мільённая ўдарная брыгада міжнароднага пралетарыяту, у тым ліку і мы, калгасьнікі «Лепшай долі», будзе і надалей, пад кіраўніцтвам УсеКП(б), змагацца за пабудову сацыялізму ў нашай краіне, за ліквідацыю апошняга, вашага, паночкі, саюзьніка ў СССР — кулака.

А калі вы, паны-фашысты, задумаеце напасьці на Савецкі Саюз, мы, калгасьнікі калгасу «Лепшая доля», усе, як адзін, станем на абарону сваёй дарагой бацькаўшчыны.

Ганьба крывапійцам і катам—польскім фашыстам!

Няхай жыве гераічная барацьба зьняволеных братоў у польскіх турмах!

Няхай жыве чырвоны фронт пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы і сацыялістычнае будаўніцтва, у нас.

Агульны сход калгасьнікаў калгасу «Лепшая доля».

Французкія пісьменьнікі пратэстуюць супроць сыстэмы зьдзекаў і катаваньняў у турмах фашысцкай Польшчы

У Парыжы стварыўся МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ АБАРОНЫ ПАЛОНЬНІКАЎ ФАШЫЗМУ Ў ПОЛЬШЧЫ. У сувязі з УСЕАГУЛЬНАЙ ГАЛАДОЎКАЙ КАМІТЭТ ВЫДАЎ АДОЗВУ, у якой чытаем:

«ФРАНЦУСКІ ІМПЭРЫЯЛІЗМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ІНІЦЫЯТАРАМ І НАТХНІЦЕЛЕМ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ВА ЎСІХ ЯЕ ПАЧЫНАНЬНЯХ».

10.000 ПАЛІТЫЧНЫХ ВЯЗЬНЯЎ — мужчын, жанчын, дзяўчат і хлапцоў, працоўных інтэлігентаў, прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяй, якія змагаюцца з дыктатурай фашызму, КІНУТЫ Ў ЗАСЬЦЕНКІ ВЯЛІЗАРНАЙ ТУРМЫ, ЯКОЮ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЎСЯ СУЧАСНАЯ ПОЛЬШЧА.

Фашысцкі ўрад карыстаецца НЯ ТОЛЬКІ ЦАРСКІМІ ЗАКОНАМІ, але нават АДШУКАЎ ЯШЧЭ АЎСТРЫЙСКІЯ ПРАВЫ КАНЦА XVIII І ПАЧАТКУ XIX ВЕКУ. НА ПАДСТАВЕ ГЭТЫХ ЗАКОНАЎ ЗА ЎСЯКАЕ ПРАЯЎЛЕНЬНЕ БАРАЦЬБЫ ВЯЗЬНЯМ ПАГРАЖАЕ СЬМЕРЦЬ АБО ПАВОЛЬНАЕ ПАМІРАНЬНЕ Ў НЯВОЛІ, КУДЫ ІХ КІДАЮЦЬ НА 10-15 ГОД.

Але польскі ўрад ня спыняецца на трыманьні сваіх палітычных ворагаў у турмах. СВАЁЙ НЯНАВІСЬЦЮ І ПОМСТАЙ ЁН ПРАСЬЛЕДУЕ ІХ І ТУТ. Турэмная адміністрацыя абыходзіцца СА ЗЬНЯВОЛЕНЫМІ ПА-БАРБАРСКУ.

КАТАВАНЫЯ САМЫМІ ДЗІКІМІ МЭТАДАМІ, З НЕЙКАЙ ЗЬВЯРЫНАЙ ЗАЦЯТАСЬЦЮ, ЗЬНЯВОЛЕНЫЯ РАСПАЧАЛІ ЎСЕАГУЛЬНУЮ ГАЛАДОЎКУ.

10.000 зьняволеных рэвалюцыянэраў РЫЗЫКУЮЦЬ СВАІМ ЖЫЦЬЦЁМ. НА ДАПАМОГУ!

АНРЫ БАРБЮС, МАРСЭЛЬ КАПІ, КАМІЛЬ ДРЭВЭ, ФРАНСІ ЖУРДЭН, ВІКТАР МАРГЕРЫТ, ЛЮС'ЕН КІТЭН, ЛЕОН ВЭРТ, ЖАН РЫШАР БЛОХ, РАМЭН РАЛЯН, Г. ШАРПАНТ'Е, ПОЛЬ ЛЁНІС, Г. БЛОХ, ШАРЛЬ ВІЛЬДРА.

Новае выступленьне супроць акупантаў у Заходняй Беларусі

ВАРШАВА, 26. У Заходняй Беларусі, ня гледзячы на ўвядзеньне ваеннапалявых судоў, ня спыняюцца сабатажныя выступленьні супроць фашысцкіх улад.

Эндэцкая «Газэта Варшаўска» і сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 24 верасьня паведамляюць аб новым праяўленьні сабатажу. За некалькі хвілін перад надыходам варшаўскага цягніка, навыкрытыя асобы зрабілі каменны насып на чыгуначным шляху Ваўкавыск-Зэльва. Былі таксама выкапаны і паклаены на рэйкі, тэлефонныя слупы.

Паліцыя правяла ў ваколічных вёсках масавыя арышты.

Забастоўка адноўлена

ВАРШАВА, 22. Паводле паведамленьня газэт, рабочыя фабрыкі Шлосэра ў Азоркаве, якія баставалі нядаўна і дабіліся прыёму на фабрыку зволеных рабочых, зноў забаставалі. Прычына — ня выплата адміністрацыяй рабочым заработку, які ім прылічваецца. У Лодзі бастуюць рабочыя раду фабрык шоўку, у сувязі з патрабаваньнем прадпрыемцаў аб зьніжэньні зарплаты.

Графіні хваляць бандыцкі рэгламант

Польская фашысцкая прэса як мага «апрацоўвае» грамадзкую думку, выхваляючы «праграсыўнасьць» новага турэмнага рэгляманту, яго «гуманітарнасьць» і г. д.

Фашысцкі «Кур'ер Поранны» нядаўна зьмясьціў артыкул графіні Велёпольскай аб новым турэмным рэгляманце і аб палітычных вязьнях. Вось як «гуманітарна» выражаецца крывавая графіня:

«Калі сярод тысячных мас гэтак званых «палітычных вязьняў», гэтых налоўанальфабэтаў, аплананых юдавымі срэбнікамі суседніх дзяржаў — знойдзецца некалькі сапраўдных «ідэйных» вар'ятаў тэорыі і дактрыны, дык... яны перанясуць найсуровейшы турэмны рэгламант, калі так лёгка глядзелі на здань шыбеніцы».

Пані графіні калі небудзь уцісьнем гэтыя словы назад у горла. Толькі на гэты раз гэтыя словы не задушаць.

(«Голас вязьня». Парыж).

Дэманстрацыі перад брамамі засьценкаў

ВАРШАВА, 25. Паводле паведамленьня «Нашага пшэглёнда» ўчора перад турмой Павіяк адбылася камуністычная дэманстрацыя. Дэманстранты былі разагнаны паліцыяй.

Дапаможам палітвязьням у фашысцкай Польшчы

Мы, рабочыя вучастку саўгасу Вязынь-Фаніпаль, з абурэньнем узьнімаем голас пратэсту супроць разгулу белага тэрору і ўвядзеньня закону аб ваеннапалявых судах над рэвалюцыянэрамі ў фашысцкай Польшчы.

Рэшуча патрабуем спыненьня крывавых расправаў і зьдзекаў, якія штодзённа ўтвараюцца над тысячамі рэвалюцыйных барацьбітоў у засьценках дэфэнзывы.

Мы заклікаем вас — працоўныя Польшчы, шчыльней згуртавацца пад сьцягам Камуністычнай партыі Польшчы і пад яе кіраўніцтвам яшчэ больш уперта змагацца з прагніўшай дыктатурай капіталу, за Савецкую Польшчу.

У фэнд дапамогі палітзьняволеным, стогнучым за кратамі польскіх турмаў, уносім 100 рублёў і выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу астатнія вучасткі саўгасу.

КОРАТКА

На паўночнай суднабудаўнічай вэрфі ў Ленінградзе слупчан на ваду дзеняты па ліку савецкі траўлер № 379.

Завод «Червона гута» (Кіяў) пачаў выраблять тэхнічнае шкло, якое па якасьці ня ніжэй за замежнае. Пачата вытворства рэнтгенашкла і коўб для тэрмасоў, якія да гэтага часу прывозіліся з-заграніцы.

Бальшавікі Узбекстана атрымалі вялікую перамогу на фронце збожжазагатовак. Плян да 20 верасьня перавыкананы. У мінулым годзе збожжазагатоўкі працягваліся да сакавіка.

Курс замежных валют, які акрэсьліваецца нямецкім рэйхсбанкам, зноў паніжан. Ангельскі фунт катыраваўся 17,6 марак супроць 18 марак напярэдадні.

Банкі, ашчадныя касы і крэдытныя ўстановы Індыі закрыты. Англа-індыйскі ўрад выпусьціў паведамленьне, што фінансавыя операцыі часова спынены ў мэтах забесьпячэньня пераходу на новы разрахунак.

21 верасьня ў Народным Камісарыяце Замежных Спраў адбыўся абмен весткамі аб узброеных сілах паміж СССР і Італіяй, прызначанымі для канферэнцыі па разбраеньні. 23 верасьня адбыўся абмен такімі-ж весткамі паміж СССР і Польшчай.

Член ЦК кампартыі Нямеччыны, дэпутат рэйхстагу Улькрыхт прыгавораны дзяржаўным трыбуналам у Лейпцыгу да двох год пазбаўленьня волі на абвінавачаньні ў «падрыхтоўцы да дзяржаўнай здрады».

Невядомымі асобамі разгромлена рэдакцыя берлінскай белагвардзейскай газеты «Руль».

У нізкіяй Каліфорніі (Мэксыка) узброеныя атрады беспрацоўных захапілі зямлю, у тым ліку і буйныя фальварні. Урад накіроўвае войскі для абароны памешчыкаў.

У штатах Аркамзас і Тэхас (ПАЗШ) пры ўборцы ўраджаю бавоўны і рысу ўжываецца прымусовая праца. Паліцыя арыштоўвае ў гаралах беспрацоўных нэграў і прымушае іх працаваць на плянтацыях за жабрацкую зарплату.

Урад СССР адказаў згодай на прапанову ўраду Фінляндыі аб непасрэдным абмене весткамі аб узброеных сілах абедзьвюх дзяржаў.

Новая радыё-станцыя, магутнасьцю ў 10 кілёват будуецца ў Ленінградзе. Новая станцыя, апрача радыёвяшчаньня будзе перадаваць таксама і здымкі па радыё.

Адбудаваны, выпрабаваны і гатоў для эксплёатацыі нафтаправод ад Ахі да Маскалева на Заходнім беразе Сахаліна.

Завод «Электрасьвет» (Масква) ужо да 1-га сакавіка 1931 году дасягнуў тэмпаў прадукцыйнасьці, прадугледжаных 1932 і 1933 г. г. А ўвесь пяцігадовы плян па колькасных і якасных паказальніках завод выканаў да 1-га верасня 1931 г. г. зн. у два гады і 11 месяцаў.

Акадэмія Навук адкрывае тры новых сэйсмічных станцый: у Шэмахе, Батуме і Грозным. Станцыі будуць забясьпечаны навейшымі ўдасканаленымі прыладамі, якія рэгіструюць зямлятрасеньні.

Хваляваньні ў ангельскім флёце ня сьціхаюць



ЛЕНДАН. У Портсмуце (ангельскі ваенны порт) сярод матросаў ідзе вялікі рух супроць якога-б там ні было скарачэньня пэнсіі. Матроскія камітэты не рэкамэндуюць падаваць у камісіі абсьле даваньня індывідуальных хадайніцтваў аб захаваньні ім ранейшага акладу, а замест гэтага высоўваюць агульнае патрабаваньне, якое датычыць харчоў, пэнсіі і пайка.

Учора 41 матрос браняносца «Гуд» падалі заявы аб звальненьні. 25 верасьня ўвойдзе ў сілу 10-процантнае скарачэньне пэнсіі: у гэты дзень флёт зноў зьбіраецца ў Портлэндзе, адкуль адправіцца для аднаўленьня асеньніх манэўраў.

КРЫЧАЎ—УПЁРАДЗЕ

КРЫЧАЎ.

ПА КРЫЧАЎСКІМ РАЁНЕ СЕНАЗАГАТОЎЧАЯ КАМПАНІЯ ПРАЙШЛА З ВЯЛІКІМ ПОСЬПЕХАМ. ЗАГАТОЎЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ СВАЯЧАСОВА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА КАМПАНІІ І РАЗГАРНУЛІ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ-БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ВАКОЛ СТВАРЭНЬНЯ КАРМОВАЙ БАЗЫ. ПЕРАД ПАЧАТКАМ СЕНАЎБОРКІ БЫЛІ ПАДРЫХТАВАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ СКЛАДЫ, ТАРА, ПРЫЁМАЧНЫЯ ПУНКТЫ І Г. Д. У ВЫНІКУ ЎДАРНЫХ ТЭМПАЎ РАБОТЫ ПЛЯН СЕНАЗАГА ТОВАК ВЫКАНАН НА 172 ПРОЦ. СЕНА ПОЎНАСЬЦЮ ЗДАНА ДЗЯРЖАВЕ І ЗЬВЕЗЕНА ЧАСТКОВА НА СТАНЦЫЮ І ЧАСТКОВА НА АДКОРМАЧНЫЯ ПУНКТЫ.

С.

Год выданьня—XV
№ 264 (4167)
Панядзелак, 28 верасьня 1931
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Рэдакцыя і адміністрацыя: МЕНСК, СЛЯВЕНСКІ, 63. Тэлефоны: рэдактар—4-27,—сакрэтар—10-74, парторгтар—13-60, прамысл.—13-60, сял. гасп.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—8-19, печаты рэдактар—6-47, пісьгарадзкой інфармацыі—10-97, выканчальны камітэт—3-01, адк. абмен—7-[illegible]

Японскія імпэрыялісты рыхтуюць

ПАШЫРЭНЬНЕ ІНТЭРВЭНЦЫІ НА УНУТРАНЫ КІТАЙ

ПРАЦОЎНЫЯ УСЯГО СЬВЕТУ ПІЛЬНА СОЧАЦЬ ЗА ПАДЗЕЯМІ НА ДАЛЁНІМ УСХОДЗЕ

Мова батарэй--тлумачэньне мірным дэкларацыям

ТОКІЕ, 27. Агенцтва Дэмпо Цусін паведамляе з Мукдэну, што японскія войскі, накіраваныя ў раён Сіньмыня (Бэйпін—Мукдэнская чыгунка), уступілі ў бой з кітайскай артылерыяй на захад ад Мукдэну. Учора японскі чыгуначны атрад заняў паўночную бяздротавую станцыю, якая знаходзіцца за 2 мілі на поўдзень ад Мукдэну.

Пад відам абароны сваіх рэзыдэнтаў

ТОКІЕ, 26. «Ніці-Ніці» паведамляе, што ў сувязі з весткамі аб «пагрозе для жыцьця, якая ўсё больш узмацняецца» японскіх рэзыдэнтаў у цэнтральным і паўднёвым Кітаі, міністар па замежных справах выклікаў да сябе кітайскага пасланьніка Цзо-Пінга і заявіў яму пратэст і папярэджаньне.

Сёньня на экстраным пасяджэньні савету міністраў морскі міністр Абэ зрабіў даклад аб меры абароны японскіх рэзыдэнтаў у цэнтральным Кітаі. Дакладчык указаў, што паміма ўжо на кіраваных для гэтай мэты ваенных суднаў падрыхтован да адплыцця так сама крэйсэр «Тэнрыу».

ТОКІЕ, 27. З Мукдэну паведамляюць, што паводле загаду Чжан-Сюэ-Ляна Цзынчжоу на Бейпін-Мукдэнскай чыгунцы арганізуецца часовы мукдэнскі правінцыяльны ўрад і штаб паўночна-ўсходняй пагранічнай аховы.

Ваенныя самалёты бамбардуюць насельніцтва

БЭЙПІН, 26. Мясцовы кітайскі і замежны друк паведамляе аб бясчынствах японскіх ваенных аэраплянаў у раёне Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі, асабліва паміж Шанхайуанам і Мукдэнам. 4 пасажырскія цягнікі ўжо падпалі пад паветраную атаку. Пекальскі пасажыраў паранена, многія забіты.

Прыступаюць да пабудовы стратэгічных шляхоў

ТОКІЕ, 26. Нарада вышэйшых чыноў японскай арміі, якая адбылася 26 верасьня, пастанавіла, што першым самым важным пытаньнем, якое падлягае вырашэньню ў сувязі з канфліктам, павінна зьявіцца пытаньне аб чыгунках у Манчжурыі. Нарада настойвае на вырашэньні ў першую чаргу пытаньня аб Гірынь-Хайрэнскай чыгунцы, паколькі пабудова гэтай дарогі мае вялізарнае значэньне для японскай ваеннай палітыкі ў Манчжурыі.

Па-ранейшаму закрыты біржы

ТОКІЕ, 26. Па-ранейшаму закрытыя біржы ў Токіё і іншых гэтрах Японіі. Брокерскія фірмы ў Токіё напярэдадні збанкрутаваньня і таму ўзмоцнена дабіваюцца магчымасьці атрыманьня як страных пазык. У сувязі з пагрозай паданьня іены ў Н�ью-ЁРК'у і іншых мясцох пастаноўлена ў пачатку кастрычніка зноў вывезьці ў Амэрыку золата на 70 млн. іен.

Парты напоўнены васкным суднамі

ШАНХАЙ, 26. Як паведамляе агенцтва Гомінь, адна японская канонерка прыбыла ў Амой. Чакаецца прыбыцьцё туды-ж яшчэ трох канонерак.

Дровы--Менску

Глускі леспрамгас выконвае заданьне

Лесбел адпусьціў 500 руб. для прэміяваньня лепшых ударнікаў

ЦК КП(б)Б — тав. Шаранговічу, СНК—тав. Галадзеду, Лесбелу

Заданьне партыі і ўраду Глускаму леспрамгасу — адгрузіць для Менску 300 вагонаў дроў. Па 25-га верасьня заданьне па падвозцы гэтай колькасьці дроў да чыгункі выканана. З іх адгружана 145 вагонаў. Прымае меры да адгрузкі рэшты і перавыкананьня заданьня.

Сакратар райкому Дзяніскевіч.
Старшыня РВК Зялёнка.
Дырэктар леспрамгасу Казакоў.

* * *

ЛЕСБЕЛ АДПУСЬЦІЎ У РАСПАРАДЖЭНЬНЕ ГЛУСКІХ РАЕННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ 500 руб. ДЛЯ ПРЭМІЯВАНЬНЯ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ І БРЫГАД ПА ВЫКАНАНЬНІ ГЭТАГА ЗАДАНЬНЯ.

Апартуніст Лунгін выключан з партыі

Нядаўна ў «Зьвязьдзе» быў зьмешчан артыкул аб бюракратычным лябірынце, у якім апынулася пабудова фабрыкі-кухні. У артыкуле між іншым быў прыведзен факт дызэртырства з фронту будоўлі начальніка работ Лунгіна. Мы сёньня маем больш даных, каб гаварыць аб асобе Лунгіна.

З першых дзён сваёй работы Лунгін пачаў скардзіцца на «труднасьці», «адсутнасьць дапамогі» і г. д. А калі на ўсіх пабудовах работы часова затрымаліся, хныканьне Лунгіна зрабілася больш частым. Ён пачаў пагражаць, што пакіне работу. Скаргі і настаўныя хныканьні ня спыніліся і тады, калі зноў разгарнулася будаўніцтва.

Лунгін пачаў штурмаваць партарганізацыю настойлівымі заявамі аб тым, каб адпусьцілі яго.

І аднойчы Лунгін на работу не зьявіўся, а паехаў працаваць у Крычаў.

Апартуніст Лунгін баіўся труднасьцяй, пасаваў перад імі, ставіў шкурныя інтарэсы вышэй інтарэсаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Бюро парткалектыву пабудоў апартуніста Лунгіна выключыла з радоў партыі.

Ц.

Будзьце ўдарнікамі палітэхнізацыі

Асеньні выпуск фізыка-матэматычнага факультэту БДУ

25-га верасьня Беларускі Дзяржаўны Універсытэт выпусьціў чарговы датэрміновы выпуск студэнтаў фізыка-матэматычнага факультэту. Гэты выпуск супадае з адказьнейшым момантам у разьвіцьці школы ў сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) пра пачатковую і сярэднюю школу.

Цэнтральны Камітэт партыі даў дырэктыву Наркамасьветам саюзных рэспублік безадкладна арганізаваць навукова-марксыцкую праграму праграм, забясьпечыўшы ў іх выразна акрэсьленыя, сыстэматызаваныя веды па матэматыцы, фізыцы і г. д. разам з гэтым ЦК даў указаньне аб неабходнасьці разгарнуць рашучую барацьбу супроць лёгкадумнага мэтадычнага пражэктарства пасаджэньня мэтадаў, на практыцы не праверяных, што асабліва яркa выявілася ва ўжываньні т. зв. «мэтада праектаў» і прапануе ўсім арганізацыям весьці сыстэматычную і няўхільную барацьбу супроць апартуністычных анты-ленінскіх скажэньняў палітыкі партыі ў галіне школьнай работы.

Настанова ЦК УсеКП(б) для выпускнікоў-фізматыкаў, як і для ўсяго настаўніцтва ўсёй партыі і найшырэйшых пралетарскіх мас, павінна быць асноўным кіраўніцтвам, асноўнай пуцяводнай ніцьцю ў іх барацьбе на культурным фронце за ажыцьцяўленьне ленінскай палітыкі ў культурным і школьным будаўніцтве.

Сучасны выпуск студэнтаў фізыка-матэматычнага факультэту падрыхтаваны да ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі.

Выпускнікі-фізматаўцы апрача тэарэтычных і практычных ведаў, як па сваёй спэцыяльнасьці, так і па пэдагогіцы, вывучылі тэарытычна і практычна электра-тэхніку, цэпла-тэхніку, працавалі на электра-цэнтралі і на машына-трактарных станцыях, прапрацавалі вялікі фізычны практыкум у лябараторыях фізычнага інстытуту БДУ. Гэта дае ім поўную магчымасьць ня толькі правесьці самім у жыцьцё дырэктывы партыі аб пастаноўцы выкладаньня фізыкі і матэматыкі ў сапраўднай ленінскай палітэхнічнай школе, але і дапамагчы настаўніцтву, прафэсыянальным і савецкім арганізацыям у раёне ажыцьцявіць на справе пастанову ЦК УсеКП(б).

Выпускнікі разьмеркаваны Наркамасьветы ў сярэдніх школах як беларускіх, так і яўрэйскіх і польскіх.

Працуючы ў школах, выпускнікі-фізматаўцы павінны добра памятаць, што ў сучасны момант, калі пралетарыят канчаткова зьніштажае клясы ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, выключнае значэньне набывае вытрымванае камуністычнае выхаваньне ў савецкай школе і ўзмацненьне барацьбы супроць усякіх спроб прыпачаціць дзецям савецкай школы элемэнты анты-пралетарскай ідэалёгіі.

Пажадаем датэрміноваму выпуску добрай і пасьпяховай работы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва.

Дэкан Фізыка-Матэматычнага Факультэту БДУ
А. К. УСЬПЕНСКІ

У Менску, Чырвонай Слабадзе 50 проц. няпісьменных не ахоплены ліквпунктамі

МЕНСК. (БЕЛТА). Ня гледзячы на дырэктывы ЦК КП(б)В і СНК аб пачатку заняткаў у школах ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці не пазней 1 верасьня, яшчэ і зараз не ва ўсіх раёнах і гарадох пачат навучальны год.

Па Менску ёсьць 1.315 чалавек няпісьменных і 1.280 малапісьменных, для якіх адкрыта 226 ліквпунктаў і 103 школы для малапісьменных. Навучаньнем яшчэ не ахоплена 200 чалавек няпісьменных рабочых, а лічба ўсіх працоўных няпісьменных, не ахопленых школамі, дасягае 800 чалавек.

Гарадзкая інспэктура не змагла пастаўіць работу так, каб да кастрычніка сьвят Менск быў горадам суцэльнай пісьменнасьці.

Прафсаюзы і камсамол прымаюць недавальняючы ўдзел у гэтай рабоце. Мэтадком дрэнна паладзіў мэтадычнае кіраўніцтва.

Яшчэ горш па Менскім прыгарадным раёне. Інспэктура ня ведае, што там робіцца.

Для ліквідацыі прарыву абвешчан дэкадзнік штурму. У сельсаветы выехалі брыгады.

Нездавальняючая пастаўлена работа і ў Чэрвеньскім раёне. Усяго павінна быць ахоплена 3.103 няпісьменных і 5.020 малапісьменных. На 20 верасьня ахоплена заняткамі толькі 1.040 чалавек.

Па Чырвона-Слабадзкім раёне павінна быць адкрыта 45 ліквпунктаў з ахопам 1.886 чалавек, але адкрыта толькі 23, якімі ахоплена усяго 391 чалавек. Школ малапісьменных павінна быць адкрыта 57 з ахопам 1.730 чалавек, адкрыта толькі 20. Школы ліквбезу не забясьпечаны памяшканьнямі і падручнікамі.

Апартуністычныя адносіны да ліквідацыі няпісьменнасьці з боку Веткаўскай райінспэктуры прывялі справу да правалу. Па Веткаўскім раёне ёсьць няпісьменных 4.409, малапісьменных — 2.350 чалавек, для якіх вызначана было адкрыць 130 ліквпунктаў, але ні адзін з іх не распачаў работы.

Недаацэнка работы па ліквідацыі няпісьменнасьці натлядаецца і з боку райвыканкому.

Адсталыя раёны павінны рашуча падцягнуцца і базывымі тэмпамі работы ліквідаваць прарыў на вучастку ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

Перадавікі рэалізацыі прэміяваны

ДУБРОЎНА. (Белта). За ўзорную работу па рэалізацыі пазыкі імя «3-га рашаючага», за поўны ахоп падпіскай усіх калгасьнікаў і перавыкананьне заданьня прэміяваны камісіі садзейнасьці Дубровенскага гарсавету—на 150 рублёў, калгасу «Чырвоны май» Сваташынскага сельсавету на 126 рублёў.

Паведамленьне

— 29/IX— у 6½ гадз. веч. адбудзецца нарада грамадзкіх інспэктароў і старшынь пастоў Бюро Скаргаў НК-РСІ (Савецкая, 55, першы паверх, памяшканьне НК-РСІ). На нараду павінны зьявіцца: з чыгункі МБВ; ф-кі «Кастрычнік»; заводу імя Варашылава; заводу «Бальшавік»; «Камунар»; з малочнага заводу; хладабойні; фабрыкі «Уход»; «Беларуска»; «Ударнік», Шпалерная фабрыкі, «Чырвонага тэкстыльшчыка»; абутковай фабрыкі. Яўка абавязкова.

Нарада замежных рабочых і палітэмігрантаў.
МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР'у І ГАРПРАФСАВЕТ
скліканюць
на 28 верасьня, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні ЦК МОПРЪСССР (Савецкая, 87)
экстраную нараду замежных рабочых і палітэмігрантаў, якія жывуць у гор. Менску.
З прычыны важнасьці пытаньня, яўка ўсіх абавязкова.
МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР'у
Менскі Гарпрафсавет.

КІНО „КУЛЬТУРА“
З 28 верасьня
НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАВОДЛЕ АДНАІМЁННАГА РАМАНУ А. ФАДЗЕЕВА
РАЗГРОМ
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ арт. В. ЯБЛОНСКІ, ЮДЗІН, І ЛЮДМІЛА СЯМЁНАВА.
Пачатак сэансаў у 7, 8-45, 10-30.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Даводзіцца да ведама, што з 1-IX-31 г.
Менская цэнтральная
ТЭЛЕГРАФНАЯ КАНТОРА
вылучаецца
ў самастойную гаспадарчую адзінку.
Усе прадпрыемствы і ўстановы, якія падавалі тэлеграмы па аванс, павінны да 1-Х уносьці авансы на бягучы рахунак Менскай цэнтральнай тэлеграфнай канторы № 77-102029
Ад устаноў, якія ня ўнясуць авансы да 1-Х, тэлеграмы прымацца ня будуць.
АДМІНІСТРАЦЫЯ

МАНЯЮ 2 пакоі ў Віцебску 27 кв. м. з выгодамі на 2 або 1 пакой у Менску. Зварачацца: Менску, друк. АДПУ, заг. Шкід, ту, камутатар ДПУ 158, або Віцебск, Кантанічская 15-а КАПУЛКІН.

ЗГУБЛЕН пашпарт, выд. Мен. міліцыяй на імя Грыцуг Т. С. Лічыць несапраўдным.

ЗГУБЛЕНА пасьведчаньне аб скончэньні 7-годні, выд. Клічаўскай ШКМ на імя Доўгага І. Ф. Лічыць несапраўдным.

„ЧЫРВ. ЗОРКА“ Пач. 7; 8-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё, драма ў 34 эпізодах.
Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм ЛУНА ЗЬЛЕВА, Зьмен. прагр. хроніка Саюзкіно
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкая бытавая драма ў 6 частках ВАСІЛІНА, Зьмен. прагр. хроніка Саюзкіно № 3
„Юны Піянер“ (будынак кіно „Культура“) — СІНІЯ КАУНАРЫ, кіна-аповесьць у 5 частках. Пач. у 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня
„СПАРТАК“ Пач. 7-15, 9 і 10-45 Каса адкрыта з 5 г. — Мастацкі фільм СІМБА у 6 частках.

Камуністычны Унівэрсытэт Беларусі імя У. І. ЛЕНІНА абвяшчае, што пры Заочна-Курсавым Сэктары Камвузу Беларусі адкрываецца
ГАЗЭТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
Умовы прыёму такія-ж, як у Заочна Камвуз. Перавага аддаецца асобам якія маюць практыку газэтнай працы і рабселькорам-ударнікам
Камвуз Беларусі імя У. І. ЛЕНІНА.

30-X-31 г. у 6 гадз. веч., у памяш. Дому Чырвонай арміі адбудзецца
зьлёт чырвоных партызанаў,
чырвоных гвардзейцаў, чырвона-знамёнцаў і сямей загінуўшых партызан.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Даклад тав. ЯРАШАВА аб працы савету партызан і далейшых задачах. 2) Аб арганізацыі штурмавых атрадаў па ліквідацыі прарываў. 3) Мастацкая частка.
МЕНГАРСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ.

Для Беларускай канторы і саўгасаў
ТРЭСТУ СЬВІНАВОД
ПАТРЭБНЫ:
БУХГАЛЬТАРЫ-ІНСТРУКТАРЫ, СТ. БУХГАЛЬТАРЫ, БУХГАЛЬТАРЫ-КАЛЬКУЛЯТАРЫ, РАХУНКАВОДЫ, ЭКАНАМІСТЫ, ЭКАНАМІСТЫ-СТАТЫСТЫКІ, СТАТЫСТЫКІ.
Зварачацца: Менск, Савецкая, 70, СЬВІНАВОД.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Галоўлітсел 337.